Дзяніс Быханькоў

Дзівосы

альбо парады сынам, што выйшлі ў гэты чароўны свет



Пятру і Роберту

1. Свет поўны дзівосаў.

2. Воля змяняе абставіны.

Асоба

Сачыць за сабой

Сынок, перш за ўсё разумей,

што ніхто і ніколі ня будзе сачыць за табой так,

як можаш ты сам.

Нават маці з татам могуць памыляцца —

чагосці ня ведаць, баяцца, заціскаць, раіць з асцярожнасці.

Кожны з нас складзены са сваіх досведаў і перакананняў.

Толькі *ты сам* ведаеш сябе,

толькі *твой дух* чуе, што будзе яго расціць,

толькі *тваё цела* ведае, чым яго зараз карміць.

Калі ты чысты і наладжаны, усё робіцца ясным.

Слухай сябе і зрабі сам сябе кропкай адліку.

Робячы любы выбар, перш за ўсё думай:

Ці набліжае гэта мяне да *маёх* мэтаў?

Як адаб'ецца гэта на *маім* гонары?

Сачыць за іншымі

Ты мусіш дапамагаць брату, бо бліжэйшага чалавека ў свеце ня будзе,

старым бацькам, якім цяжка самім,

сачыць за дзецьмі.

Яны — твая кроў, тваё племя назаўсёды, ключ да твайго вечнага перараджэння.

Клопат аб жанчыне, пакуль яна гадуе тваё безабароннае дзіця — таксама твой абавязак.

Рупіся аб тых, хто ў тваёй камандзе і не запляміў сябе ненадзейнасцю.

Але ты дапаможаш іншым значна лепей, калі ўжо дапамог сабе.

Гэта нязвыклая думка, бо нашае першае памкненне —

кінуцца рамантаваць, ахвяраваць сабой, вырашаць праблемы.

Гэта натуральна, бо гераізм — гэта клей, што трымае Сусвет.

Усё ж-такі, найперш стань моцным сам.

Дапамагаючы слабейшым пакуль сам слабы — згубіш усё, бо змарнуеш сілы.

Слабы застанецца слабым роўна столькі, колькі захоча,

але цяпер і ты ўжо будзеш аслаблены.

Да таго ж, слабыя амаль не адчуваюць удзячнасці,

бо не разумеюць кошт высілкаў і ахвяр.

Не марнаваць сябе

Пазбягай залішняга клопату аб іншых вольных, дарослых людзях.

Ўнікай маніпуляцыяў і не ахвяруй сваім рухам дзеля тых,

хто можа выжываць і расці сам.

Ты ня мусіш цягнуць за руку школьных сяброў.

Ты ня мусіш даваць грошы працаздольным сваякам.

Ты ня мусіш забяспечваць жанчын, з каторымі сустракаешся.

Ты ня мусіш трываць лайдакоў і крывасмокаў.

Рабі тое, калі *хочаш*, але абавязку такога няма.

Залішне дапамагаючы самастойным асобам, ты робішся навязлівым і губляеш іх павагу.

Ну а калі дапамагаеш тым,

хто раней адмаўляўся ад цябе,

сумняваўся ў табе,

ты паказваеш ім, што яны могуць і далей цябе зневажаць і мець за тое ўзнагароды.

Пераконваць і вучыць

Адзіны чын кагосці ў нечым пераканаць — уласны прыклад.

Нельга навучыць дзяцей даводзіць справы да канца,

калі яны бачаць як ты пакідаеш усё на заўтра.

Нельга змусіць іншых да праўдзівасці, калі сам пастянна хлусіш.

Нельга патрабаваць парадку, калі твае справы раскіданыя і размазаныя навокал.

Нельга навучыць, можна толькі навучыцца.

Калі ў цябе *хочуць* вучыцца — то й навучацца.

А *хочуць* вучыцца толькі ў годных.

Чым менш словаў ты скажаш, тым больш запомніцца кожнае з іх.

Пра бойкі і войны

Калі перамог — святкуй.

Дзякуй Багам і Продкам, не саромейся і не прыніжай сваёй перамогі.

Калі прайграў — не хлусі сабе.

Скажы: "я прайграў тут".

Зразумей чаму і рухайся далей.

◇／╳◇╳＼◇

Прасі Багоў і Продкаў падказваць табе, якія бойкі годныя а якія — не.

Адчувай ціск былых пакаленняў.

Дзядоў, што ў зямным жыцці мелі розныя густы, перакананні, ішлі рознымі шляхамі;

але мелі агульнае: волю, рух, вынаходлівасць.

Дзякуючы сіле і розуму найлепшых мы тут.

Большасць таго, з-за чаго мы злуемся, — дробязі.

Яны глядзяць на цябе: ці ўваляць рух, ці парадуюцца сіле?

Ёсць вартыя бойкі і апраўданыя ахвяры,

а ёсць драбяза, на якую лепш не кідацца.

◇／╳◇╳＼◇

Але ж мужчыне жыццёва неабходнае супрацьстаянне.

Змаганне натхняе, узмацняе, дае сапраўднае багацце духу.

І гэта адна з самых складаных задачаў жыцця: знаходзіць *вартыя* бойкі.

Пераймайся гэтым, і ўсё астатняе зробіцца лёгкім.

Справы, грошы, сябры, жанчыны — усё йдзе ладам калі мы ўдзельнічаем у годных, вартых войнах.

А калі наадварот — марнуем свае сілы і гонар продкаў.

◇／╳◇╳＼◇

Звыкай змагацца і перамагаць, рух важнейшы за накірунак.

І ў той жа час, толькі вартыя, годныя войны даюць сапраўдныя скарбы.

Óðinn Allfǫðr — сума продкаў-пераможцаў, ён можа паказваць годныя бойкі.

Мудрасць у перамозе

Афіна спрыяе разумным ***і*** пераможным.

Без перамог мудрасць ня мае сэнсу.

Розум, што не прыкладаецца да дзеяння, не нараджае Божыя іскры.

Нашто тая мудрасць, што не вядзе да перамогі?

Гадзінамі можна абдумваць нешта і ведаць усе адказы.

Гадамі можна мець рацыю і быць на слушным баку гісторыі.

Але ў што выліваюцца твае веды?

Дзейныя здабываюць больш скарбаў за разумных.

Гераізм

Гераізм — гэта клей, што трымае разам свет людзей.

Гэта наша сувязь з Багамі, тое што набліжае нас да вышняга.

Гераізм перараджае і дае паліва ўдачы на пакаленні наперад.

Героі атрымліваюць найлепшых жанок, сяброў, атачэнне, бясконцы магнетызм.

Але гераізм мусіць быць своечасовы, годны, разумны.

Да гераізму патрэбна дайсці з досведам і чуццём.

Вельмі важна адчуць патрэбны момант, накірунак, і кропку прыкладання сваёй волі.

Гераізм вызначаецца ня вынікам, а памкненнем.

На свеце шмат жывых герояў, і яшчэ больш тых хто загінуў глупа.

Гераізм гэта не абавязкова страта ўсяго,

Але гэта абавязкова *гатоўнасць рызыкнуць* ў годным памкненні.

Тут немагчыма даваць парады, бо гэтым кіруюць Долі.

Кожны мусіць сам пазнаць той момант і свой шанец пакласці ўсё і перамагчы.

Не пераймайся аб мінулым, страчаныя магчымасці вернуцца з новымі шанцамі.

Змагання хопіць на ўсіх людзей і на ўсе часы.

Вера

Харaство

Малюнкі свету цудоўныя.

Карані дрэва падобныя да галінаў.

Нашыя дзеці падобныя да дзядоў і бабуль.

Спіралі галактык падобныя да віхураў над рачной тонню.

Багі падобныя да гармонаў, што кіруюць нашым целам.

Пярун гаворыць з намі праз тэстастэрон, Вялес — праз адрэналін.

Усё ва ўсім.

Усё, што ты любіш у гэтым свеце — язычніцкае.

Нават усё, што адзінабожцы любяць найбольш у сваіх верах — даўняе, язычніцкае:

Воля, сіла, межы, кантрасты, назіранні, правілы, малюнкі, свежасць, імпэт, рост.

Адзінабожжа — зладзейства да гэтага свету і ягонае прыроды.

Адзінабожжа гэта бязбожжа.

Да адзінабожжа вядуць два шляхі: першы — ад звычаю;

другі — ад страху і слабасці.

Адлучаныя ад радасці людзі шукаюць яе ў адзінабожжы, і не знаходзяць.

Гэты свет — недарэчнасць і пекла для адзінабожцаў.

Але ж ён цудоўны і казачны, і для нас ён — рай.

Нашыя Багі

Багі *і* літаральныя *і* метафарычныя, і ў гэтым няма супярэчнасці.

Дзесяткі тысячагоддзяў мы выходзім з іх і вяртаемся ў іх.

Яны ўсё даюць і бяруць як хочуць — і вучаць цябе выпраменьваць Волю гэтак жа.

Да кожнай часткі тваёй асобы, кожнага твайго пачуцця, кожнага этапу жыцця, кожнай справы —

ёсць адпаведныя Багі.

Досвед набліжае цябе да іх.

Перамогі набліжаюць цябе да іх.

Пражыванне роляў набліжае цябе да іх.

Жыццё нам дадзенае, каб пражыць яго ў як мага большай колькасці роляў.

Быць пераможаным, пераможцам, бацькам, сынам, будаўніком, ваяром, майстрам, вучнем.

Жыццёвы досвед дае адказы на ўсё.

Пражываць ролі і набываць досвед — істотней за бясконцыя развагі.

Багі праяўляюцца ў дзеянні, а не ў мысленні.

Звароты і малітвы

Маліцца карысна.

Малітвы усталёўваюць апоры з бо́льшымі за нас.

Мы знаходзім іх, і Яны знаходзяць нас.

Немагчыма быць няшчасным, калі навокал ёсць большыя і меншыя.

Толькі зроўненыя — няшчасныя.

Збудуй свае малітвы і ўзмацняй іх паўтарэннем і асэнсаваннем.

Тлумач сабе свет з радасцю, выкрывай сувязі, вынаходзь словы.

Тры часткі ў малітве — зварот, падзяка, а тады ўжо й просьба.

Знайдзі тых, каму маліцца прыемна, тых, хто ўзвышае.

Не паказвай свае малітвы нікому, пакуль ня звыкся да іх і не натачыў іх —

гэта зойме не адно кола году.

Кажы Славу Багам, Продкам, сабе, і нашчадкам.

Вось формула і сувязь, вось іерархія і кола.

Ты не адзін — ты пачынаешся так глыбока, што захоплівае дух.

Ты ня скончышся, а сягнеш за далягляд часоў — там мільёны новых дзён твайго роду.

Звяртайся да Сонца, Месяца, Зямлі, месцаў, рэчак, Вагню, бакоў свету.

Звяртайся, калі табе добра, нават больш чым калі табе цяжка.

Яны ўсе розныя.

Іхная разнастайнасць узбагачае твой дух.

Сонца дае жыццё і рост, Месяц бачыць цябе наскрозь і натхняе;

Поўнач дапамагае з рашучасцю, дысцыплінай, грашыма;

Поўдзень з каханнем і вандроўкамі;

Усход нясе здароўе і жыццяздольнасць;

Захад дае светлую тугу і Божыя іскры ва ўсім што робіш.

Знайдзі тыя зачэпкі сам і радуйся ім.

Перараджэнне

У самай сярэдзіне нашай веры — перараджэнне.

Тое, што схаванае ва ўсіх казках і мітах, тое, да чаго прыводзяць Багі,

тое што мы пачынаем бачыць з часам ва ўсім.

Нішто і ніхто ў свеце не прыходзіць з ніадкуль і не губляецца проста так.

Ніякага *пастаяннага* пекла ці выраю па-за гэтым светам няма.

Гэты свет і ёсць пекла для няшчасных і вырай для шчаслівых.

Ты вяртаешся ў яго і застаешся ў ім, у той ці іншай форме, адпаведна механізмаў што нам не абавязкова разумець - у крыві, ідэях, словах, гісторыях, месцах, справах.

і толькі ты вырашаеш, якім будзе наступнае кола тваёй свядомасці.

Вырашаеш сваім жыццём, гонарам, досведам, і памылкамі што мусіш выправіць.

Вырай — гэта калі хутка нараджаешся зноў.

Цёпла, п'еш салодкае матчына малако, і сніш свае ранейшыя перамогі.

Гэта і ёсць святочны пір з Одзінам у Валгале.

На галаве пульсуе раднічок, існаванне неверагодна лёгкае і шчаслівае.

Палеглыя героі перараджаюцца адразу, і ім шчасціць усё жыццё.

Невытлумачальна для іншых.

Некаторыя ўважаюць перараджэнне пакараннем.

Для іх свет — пекла, ім з кола вяртанняў хочацца *вырвацца*.

Нібы недзе *там*, звонку, сканчаюцца клопаты і супярэчнасці.

Ці былі яны на лясной паляне, нікуды не спяшаючыся?

Прыглядзіся — колькі травінак, трэсачак, усё залітае Сонцам.

На кожным лісце цэлы свет.

Але потым цямнее, халаднее. Іншыя гукі, іншыя жывёлы. Рэзкія крыкі ўсю ноч.

Назаўтра знікае ноч і йзноў сонечна. Ізноў бягуць сокі па зёлках і трымцяць матылькі.

Усё адбываецца **тут**.

Вельмі бязрадасна не лічыць гэты свет дзівосным.

Хто адмаўляе перараджэнне — не да канца пазбавіўся адзінабожных страхаў.

Некаторыя ж наўмысна хочуць ператварыць нашую прыродную веру на змрочны культ.

Назірай і разумей сам.

Нашыя Багі ёсць працягамі нашага жыцця, кожны ў сваім надзеле.

Нашае жыццё — працяг Боскіх сілаў і спраў па ўладкаванні Свету.

Гэта складаны і выдатна наладжаны механізм з карункаў лёсу, вольных выбараў, асабістай адказнасці, і здаровай колькасці выпадковасцяў.

Адмаўляцца ад гэтага свету, пагарджаць шматлікімі ягонымі праявамі, жыць у атрутных спадзевах — дарагая памылка.

Бо і вырай, і пекла — тут, мы нараджаемся ў іх зноў і зноў, самі робячы сябе.

У крыві мы маем усё, што трэба, і Багі радуюцца тым, хто карыстаецца назапашанымі скарбамі Волі.

Сіла

Воля

◇\◇/◇

Сіла волі — паліва для рухавіка твайго жыцця.

З волі вырастае поспех любых тваёх справаў,

яна — найважнейшы штодзённы рэсурс.

◇\◇/◇

Кожную раніцу мы атрымліваем абмежаваны запас волі,

робячы дзённыя справы — спусташаем яго.

Ранішнія мы — самыя чыстыя і дужыя.

Пільна сачы, на што ты марнуеш ранішнюю волю.

Ніякіх дробязяў, гутарак, марнатраўства —

толькі самая цяжкая, самая важная, самая разумная, і загадзя падрыхтаваная праца.

◇\◇/◇

Розніца між табой сёння і табой з тваёх мараў —

толькі ў пастаянным, паслядоўным, і ўпэўненым прыкладанні волі.

◇\◇/◇

Вашыя продкі змянялі воляй абставіны, толькі таму вы ёсць, і вы такія, якія ёсць.

Спыняцца нельга, бо вы і ёсць яны.

Досвед

Досвед дае Волі дзейнічаць разумна.

Досвед не заменіш абсалютна нічым.

Ніякай адукацыяй, размовамі, парадамі, кнігамі.

Слабейшы, але больш дасведчаны баец лёгка можа перамагчы мацнейшага.

Досвед — няроўная перавага.

Здабывай досвед як мага хутчэй, не адкладай.

Лепш аднойчы паспрабаваць самому,

чым прачытаць тры кнігі альбо спытаць восем чалавек.

Але ж і за пераказаны досвед самыя разумныя даюць вялікія грошы.

Адзін толькі досвед і здольнасць яго падаць могуць уладкаваць цябе ў жыцці.

Фізічна немагчыма, па законах гэтага свету немагчыма,

каб больш дасведчаны меў менш варыянтаў, ідэй, інструмэнтаў, думак, назіранняў.

Таму спраўджвай каго ты слухаеш.

Сталы ня слухае маладзейшага,

дзетны — бяздзетнага,

сухі — тлустага,

працавіты — лянівага.

А ў іх часта добра падвешаныя языкі, гэта блытае.

Інтуіцыя

Інтуіцыя — мысленнье больш тонкага і глыбіннага парадку,

вынік пастаяннага фонавага падліку варыянтаў і імавернасцяў.

Гэта праца мозгу, што йдзе па сваёх законах і ў сваім тэмпе.

Intuitio — сузіранне. Пакуль ты назіраеш, яна працуе.

Амаль не здаследаваная, таямнічая, тым ня менш існая і беспамылковая.

Заўсёды слухай інтуіцыю, хвалі сябе за яе, вітай яе адказы.

Выгадуй яе ў моцнага дарадцу.

Ты заўсёды маеш права не тлумачыць вырашэнні, што прымаеш з інтуіцыі.

Словы могуць парушыць яе.

Проста скажы: “я так адчуваю.”

Чым менш будзеш тлумачыць, тым лепш цябе зразумеюць.

Першае ўражанне заўсёды самае вернае.

Аб чалавеку, аб прапанове, аб навіне, аб месцы.

Заўсёды адзначай свае *першыя* ўражанні. Давай ім шмат вагі.

Добра наладжаная інтуіцыя нават сама падкажа табе, што яна збіваецца.

Інтуіцыя існуе, а значыць яе можна развіваць.

У яе некалькі складнікаў: досвед, дух, хуткасць.

Досвед трэба атрымліваць, памыляючыся хутка.

Кожная наступная спроба мусіць быць мацнейшая, хутчэйшая, і больш пралічаная.

Дух жа патрэбны, каб даводзіць да канца спробы, нават калі яны нікуды не вядуць.

Дух неабходны, каб спрабаваць яшчэ раз пасля няўдачы.

У інтуіцыі ціхі голас.

Пачуй яго праз тлумачэнні, аўтарытэты, моду.

Упэўненасць

◇

Вер у сябе,

Ірацыянальна і непахісна.

◇

Нават ня вер, а проста ведай.

◇

Ведай, што можаш падняцца ад усяго.

Ведай, што за шэсць месяцаў зможаш змяніць усё ў жыцці, калі захочаш.

Ведай, што можаш выправіць накірунак і прыйсці куды трэба.

◇

Гэтая вера перадаецца на ты хто побач, запальвае іх.

Гэтаксама яна сілкуе і запальвае цябе самога.

◇

Выбудоўвай самапавагу.

З дробязяў, малых нязначных абяцанкаў, што выконваеш напоўніцу.

Ты ведаеш калі ты сам хлусіш, таму сабе хлусіць цяжка.

І наадварот працуе — хвалячы сябе за дробязі, пачынаеш абрастаць упэўненасцю.

Выбары

Абірай, дбаючы аб *сабе*.

Куды прывядзе *цябе* кожны з варыянтаў?

Шмат што вызначана Долямі, але ты зразумееш свой лёс толькі гледзячы *назад*.

А каб намацаць яго, захапіцца ім, ты мусіш абіраць разумна.

Абірай, ведаючы свой досвед.

Што было ў мінулы раз з падобнага?

Ня будзь закладнікам даўнейшых выбараў.

У новых абставінах можна дзейнічаць інакш ад ранейшых.

Але ж выконвай дамовы з іншымі, а калі немагчыма — кампенсуй.

Ва ўсіх дамовах трэба ведаць абставіны, змяненне якіх дазволіць змяніць дамову.

Сыходы

Калі зачыняюцца адныя дзьверы, заўсёды адчыняюцца іншыя.

Шкадаваць аб тым, што ня вырашыўся — горай чым шкадаваць, што выйшла *трохі ня так*.

Рашучасць — частка магнетызму.

Закрывай пытанні і не глядзі назад — тады Доля дасць новых і новых магчымасцяў.

Збытак ва ўсім — багацце навокал і багацце ўнутры.

Зразумей, што варыянты бясконцыя.

Свет — бы шматвымерны калейдаскоп.

Страсянецца трохі — і ўсё іншае, хаця б і з тых жа часцінак.

Магнетызм

У некаторых людзей ёсць надзвычайны магнетызм,

што адчыняе ім дзверы ў жыцці,

іначай зачыненыя.

Магнетызм — тое што дае

той самы *дадатковы позірк*, *невытлумачальную* перавагу,

пускае куды *нельга*,

дазваляе, хаця *ўжо позна*.

Магнетызм — гэта калі іншым прыемна згаджацца з табой.

Калі новым людзям здаецца, што яны *недзе цябе ўжо бачылі*.

І хоць магнетызм збольшага даецца ад нараджэння і гераізму продкаў,

яго можна таксама і развіваць.

Каб развіць і ўзмацніць магнетызм, практыкуйся ў

Непрадказальнасці

У цябе няма пратаптаных сцежак на каторых цябе можна злавіць.

Здзіўляй больш — і ў буйным і ў дробязях.

Таямнічасці

Не рэкламуй свае планы, ані малыя, ані вялікія.

Паказвай толькі вынік, хай думаюць што табе ўсё лёгка далося.

Маўленні па-свойму

Не абавязкова кажы так, як кажуць усе.

Кажы свежа і вобразна, твае словы мусяць запамінацца.

Постаці і рухах

Леў не падскоквае, калі побач хрумсціць галіна.

Спакойныя рэакцыі на наваколле заспакойваюць людзей побач з табой.

Ашчадным стаўленні да сваіх сілаў

Не глядзі пустых і брудных фільмаў, не абжырайся за кожным абедам.

Не выгарай эмацыйна зранку, стварай больш чым спажываеш.

Адвазе

Будзь бясстрашным і паказвай гэта да месца і не.

Калі трэба, прыкідайся бясстрашным, пакуль ня станеш такім.

Практыкаванні ў магнетызме дадаюць у жыццё радасць

пераносіць дробныя і смешныя перамогі на цэлыя чароды здабыткаў.

Боль і траўмы

Боль і траўмы гостраць нас.

Вызначаюць нас, выбудоўваюць нас.

Цяжкасці робяць нас уласна *намі*.

Вельмі дзіўнае жаданне — раскалупаць сябе дашчэнту,

выпрастаць абсалютна ўсё з чаго ты складаешся.

“Прапрацаваць” і “вылячыцца”, распусціць увесь былы боль.

Што застанецца ўрэшце? Набор звычак, гісторыя даставак, прычоска?

Ніякага імпэту, глыбіні, прагі, голаду.

\◇/

Ідэя аб тым што ты мусіш быць заўсёды роўным,

задаволеным,

шчаслівым,

замірaным,

залагоджаным воблакам —

шкодная ідэя.

\◇/

Так губляецца вастрыня і рух.

Шчасце — ня роўная стэрыльная пустэча, а ланцуг змагання.

Быць вольным

◇◇

Быць вольным — тое заўсёды мае свой кошт.

Ніхто не нараджаецца ў волю,

Ні на каго не згружаюць волю Багі, не праверыўшы.

Вольнымі робяцца праз працу, кроў, цяжкасці.

Страхі і скарбы

Усё што ты любіш, усё што ты хочаш

— па той бок ад страху.

Таму і Калядныя падарункі даюць Ніжнія —

барадатыя, махнатыя, спацелыя, непрадказальныя, крыклівыя, рэзкія.

І летняя Папараць-кветка — ініцыяцыя праз страх.

Ці знойдзеш у вусцішы, ці данясеш ня кінуўшы?

Бо толькі праз дотык да страху і пераадоленне яго ты бярэш скарбы.

Усе баяцца, нават тыя, пра каго ніколі не падумаеш: дзеля таго і іхны магнетызм.

Нармальна мець страх перад выпрабаваннямі, пачынаючы новае.

Калі тое, да чаго ты імкнешся, не палохае цябе, дык можа ты занізка цэліш?



Прывучы свой розум: за страхам — скарбы.

Захочаш скарбы — пойдзеш праз страх.

агромністасць

◇◇◇

Твае мэты і справы могуць цябе палохаць час ад часу.

Гэткая агромністасць, што раптоўна навальваецца калі засынаеш.

Ўмомант зганяе сон і звужае зрэнкі нават у цемры.

Нейкае пачуццё раптоўнай

сцяны,

што водаспадам рушыцца

на цябе з усіх бакоў.

І ты перад ёй малы,

Цалкам размазаны.

Але яна ж і выварочваецца ў лавіну радасці ад маленечкага штуршка,

і ты цешышся той радасцю, пакуль пачуццё не знікае да наступнага часу...

Хай гэта застанецца самай таямнічай часткай.

Слабасць

Сумнёвы

Сумнёвы — прычына ўсіх пакутаў.

Калі вырашыў — дзейнічай.

Мяняй план *толькі* пабачыўшы нейкія вынікі ці новую інфармацыю.

Калі нешта пачаў, вызначы, да якога часу ня будзеш думаць аб сваім выбары.

Размовы ўнутры аслабляюць.

Сумнёвы і абмеркаванні ідуць рука аб руку.

Сумнёвы — жаночая рыса.

Жанчыны сумняюцца заўсёды і ва ўсім, гэта іх прыродная праграма выжывання,

але яны ж і цягнуцца да тых, хто раскідае сумнёвы і жыве бяз іх.

Пошласць

Праз пошласць пралазіць у гэты свет шмат зла.

Пошласцю ўпрыгожваюцца нелюдзі каб падабацца прастакам.

Калі не адчуваеш, не фільтруеш пошласць, то робіш нядобрыя выбары і слухаеш ня тых.

Пошласць ухваляе і вырошчвае твае сумнёвы.

Пошласць цяжка апісаць. Яе трэба адчуваць.

Гэта няшчырыя, агульныя фразы, нелагічныя пераходы, заклікі да пачуццяў, недарэчныя паўтарэнні чужога, несвоечасовасць.

Пошласць — гэта калі маладыя душы прыкідаюцца сталымі.

Пошласць — жыццё не па досведзе.

Чуласць да пошласці можна развіваць.

Спажывай старое мастацтва, міфы, сагі.

Чытай пра вялікіх, цьвяроза аналізуй.

Цярпі і правярай усё сам, сваёй працай.

Назапашвай досвед і ўзмацняй магнетызм.

Адзінае

Калі цягне ўчапіцца за нешта адно, калі здаецца што гэта *яно*,

тое самае

дае ўсе адказы

Цягне заякарыцца, нічога больш не ведаць,

усім расказаць, усіх пераканаць —

Тое амаль заўсёды часы слабасці.

Нішто ў свеце ня ведае ўсё.

Ніхто ў свеце не кіруе ўсім.

Свет — падзелены

на ворагаў і сяброў,

слабых і дужых,

карыснае і шкоднае,

павольнае і хуткае,

жаночае і мужчынскае.

Больш за тое — свет перадзельваецца і змяняецца штохвіліну.

У гэтых падзелах ягоны рух і ягонае харaство.

Цела

Кантрасты

Нашае цела наладжанае, каб існаваць у кантрастах.

Мы мусім адчуваць і сытасць і голад, і стрэс і спакой, і стому і свежасць.

Змаганне, страх, радасць, холад, спёка — чаргаванне гэтага і ёсць *шчасцем і здароўем*.

Чалавек ня зроблены, каб увесь дзень сядзець пры лядоўні.

Недахоп руху, недахоп уражанняў, лішак ежы — прычыны хваробаў сучаснасці.

Разгойдвай свой лад жыцця, гартуйся разнастайнасцю.

Ня толькі вышкалы і практыкаванні, але пастаянны рух.

Ня толькі плынь мастацтва, але й часы поўнай цішы.

Стрэс

Кароткі, раптоўны стрэс — карысны.

Выкід гармонаў, скок, штуршок, праверка ўсіх сістэм.

Пастаянны, фонавы стрэс — шкодны.

Твая мэта — выбудаваць жыццё так, каб ня мець яго.

Цяжкасць у тым, што сучаснае грамадства заснаванае на хранічным стрэсе.

Сучасны свет нармалізуе яго, хавае пад ілюзіяй камфорту.

Пошласць жа выстаўляе хранічны стрэс неабходнасцю праз жарты і байкі.

Гэта хлусня, можна і без яго.

Голад

Адчуваць голад хаця б раз на суткі — нармальна і вельмі карысна.

Голад — не сігнал аб тым, што з табой нешта ня так.

Голад толькі азначае, што табе самы час *задумацца* аб наступнай ежы.

То бок, збірацца на паляванне, выпраўляцца ў ягаднік, лезці ў ваду па рыбу.

У маштабах чалавечай гісторыі мы зусім нядаўна сталі жыць, пастаянна акружаныя ежай.

Піраміда патрэбаў

Глыбінныя, базавыя патрэбы — першасныя.

Найперш — дастаткова спаць.

Затым — пазбягаць стрэсу.

Далей — напаўняць жыццё сэнсам, уражаннямі, мэтамі, і змаганнем.

Потым — рухацца і нагружаць сябе.

І тады ўжо — харчавацца чыста.

Толькі калі даеш рады з асноўным ужо пачынай наладжваць танчэйшае.

Калі штоноч не высыпаешся — не хвалюйся аб бялковых парашках,

спачатку пачні спаць.

Калі жывеш у пастаянным стрэсе — не пераймайся аб спартовай праграме.

Спачатку выключы стрэс.

Рух

Мала любіць практыкаванні і вышкалы.

Трэба любіць *натуральны рух*.

Тваё цела хоча рабіць шмат чаго, а ня толькі прысядаць, цягнуць, альбо ціснуць.

Ты зроблены каб *поўзаць, скакаць, плаваць, караскацца, кідаць, даставаць, біцца, паднімаць, зрываць, уцякаць, саскоквaць, чапляцца, пераскокваць, высочваць*.

Уся палітра рухаў будзе трымаць у добрай форме кожны сустаў,

кожную маленечкую цягліцу, пра якую ты нават і ня ведаў,

выпраўляць тваю постаць, даваць табе сігнал: я сапраўды жыву!

Таму — робіш прысед? Заскоквай яшчэ і на камяні і дрэвы.

Навучыўся падцягвацца? Ускараскайся на скалу.

Прачнуўся? Папоўзай, пахадзі мядзьведзем, катом, качкай, паскачы як малпа.

Заўсёды гуляй.

Як дзіцём ты скакаў, сядзеў на дрэвах —

няма аніякай прычыны спыняць гэта ў дарослым узросце.

Будзь заўсёды хлопчыкам што гуляе.

Ежа

◇◇◇◇◇

Абірай сапраўдную ежу.

Ежу, на якую глядзіш і разумееш, з чаго яна зробленая.

Чым менш зменена чалавекам ты ясі — тым лепей.

◇◇◇◇◇

Разнастайнасць колераў, тэкстур, смакаў;

абірай мясцовае і сязоннае.

◇◇◇◇◇

Гэтаксама, як музыка мусіць утрымліваць дастатковую колькасць цішыні,

ежу мусіць адцяняць і дапаўняць голад.

Не адчуваючы ніколі голаду, цела забывае навошта яму есці.

Адзенне

Калі няма нармальнай V-формы цела, заўважнай таўшчыні рук,

і адсотак тлушу ў целе больш за 20% — зашмат пераймацца адзеннем не дапаможа.

Хадзі ў чым хочаш, прыходзь у форму, вырошчвай сябе і свае справы.

Калі ўжо пераймацца, то пра абутак.

Усе людзі вывучаюць твой абутак у першую секунду — і складаюць уражанне назаўсёды.

Важна мець стыль, ня так важна — які.

Рокер, скейтер, каўбой, банкір, мастак, паляўнічы, гарадскі лайдак — у кожнага ёсць прыхільнікі і ненавіснікі.

Мяняй стылі як і калі хочаш, — але заўсёды будзь прыблізна ў адным.

Ні ў якім разе не марнуй больш за 5% часу на гэта ўсё.

Знайдзі нешта, давядзі да розуму, і рабі аднолькава.

Калі падышла кашуля — купі адразу некалькі.

Падбяры падобнае і камбінуй бяз роздумаў.

Чым больш волі марнуеш на стыль, тым менш яе застаецца на справы.

Кожную раніцу думаць што апрануць — значыць запрашаць хаос у жыццё.

Лад жыцця

Раніца

Марнаванне раніцы — самы надзейны шлях да няшчасця.

Раніцой ты маеш найчысцейшы розум,

наймацнейшую Волю,

найяснейшыя думкі.

Ня нішчы раніцу гульнямі, фільмамі, музыкай, размовамі, спрэчкамі.

Не выпальвай розум нічым азартным, хвалюючым, эмацыйным.

Спачатку — некалькі гадзінаў працы.

Здымі вяршкі з ранішняга розуму, перазагружанага, ачышчанага, магутнага.

Пачынай дзень са стварэння — і будзеш узнагароджаны роўным, ясным настроем.

Наладка светагляду

Ёсць толькі тры варянты наладкі сябе:

1. Наладзіць сябе на сілу, спакой, шчасце, смеласць, справы, грошы, добрых жанчын;

2. Наладзіць сябе на лайдацтва, зайздрасць, страх, сумнёвы, няшчасце, адзіноту;

3. Дазволіць іншым наладзіць цябе: школе, бацькам, царкве, ўраду, статку сяброў, жонцы.

Памер высілкаў для першага ці другога шляху аднолькавы.

Абіраючы першае ці другое, ты пражываеш сваё жыццё, шчаснае ці няшчаснае, але *сваё*.

Абіраючы трэцяе, ты пражываеш *чужое* жыццё.

Няма нічога страшнейшага, чым разумець напрыканцы што пражыў чужое жыццё.

◇╳◇╳◇╳◇

Жыццё нам даецца менавіта каб вырашыць *свае* нявырашаныя пытанні.

Не кідайся па баках калі ўжо адчуў свае мэты.

◇╳◇╳◇╳◇

Наладжвай і падлажвай сябе цягам дня, з ранку і да вечару.

Раніцой кажы сабе чаго чакаеш ада дня, увечары хвалі сябе за тое, што зрабіў.

Ці ішоў ты да сваёх мэтаў, ці ёсць нешта, што мусіш лепш рабіць заўтра?

Кажы сам сабе, чаго ты варты.

Слухай што адказвае галасок унутры, ці верыш ты сам сабе і сваім малітвам?

Люстэрка і гадзіннік

◦╳╳╳╳╳╳╳/◇\╳╳╳╳╳╳╳◦

Калі разбіралі рэчы ў кватэры майго дзядулі (абодва вы былі са мной, ці памятаеце?)

Я заўважыў нешта пра прастору ў якой з маленства рос:

Амаль з кожнай кропкі можна бачыць люстэрка і гадзіннік.

Паўсюль.

У спальні з ложку.

У кухні ад рукамыйніка.

Ля дзвьярэй да вуліцы.

У кухні ад пліты.

У залі ад канапы.

У калідоры ля тэлефону.

У залі ад стала.

З балкону ў пакоі.

Малым я глядзеўся там у *некаторыя* люстэркі і *некаторыя* гадзіннікі.

Але толькі дарослым заўважыў, як знітаваная імі прастора.

Так не згубіш -ся.

Так не згубіш дзень.

Вядома, што адносіны людзей лепшыя ў тых памяшканнях, дзе ёсць больш люстэрак.

Я правяраў нават адзін — побач з люстэркамі лепш адносіны і з сабой.

У тыкім жытле цяжка лайдачыць, сумаваць, шкадаваць сябе.

Паўсюль правяраеш сам сябе: які ты? Вось ты, менавіта такі. Навошта ты? Ты ведаеш.

Паўсюль правяраеш час: не дарэмна ідзе? Колькі і што я раблю? У якой я частцы дня?

Always be building

Як мага хутчэй вазьмі звычку ствараць больш чым спажываеш.

Перш за ўсё ў інтэрнэце.

Адам Глобус выдатна напісаў аднойчы:

"Інэрнэт бы лядоўня, калі ты туды нічога не паклаў — то няма чаго й зазіраць."

Заўсёды пішы і занатоўвай усё, што назіраеш і да чаго прыходзіш.

Кожная нататка можа стаць артыкулам, кнігай, часопісам, сайтам, лістом, бізнэсам.

Кожны фотаздымак мае тую ж сілу.

Кожны гітарны рыф можа стаць песняй, альбомам, гуртом.

Кожная думка можа стаць звычкай, сістэмай, грашыма, славай.

Вынікі любой тваёй працы — твае найлепшыя сябры.

Ніколі ня ведаеш, што менавіта стрэліць і панясе цябе па жыцці.

Новая праца — найлепшы адпачынак ад старой.

Ад музыкі адпачывай кнігамі, ад продажаў дызайнам, ад перамоў пісаннем, ад жалеза вандроўкамі.

У цябе неабмежаваныя магчымасці ў стварэнні свайго сусвету.

Так знітуеш жыццё і будзеш мець сілкаванне ў любы шторм.

Always be building

Нататнік

Нататнік тчэ час у гожы дыван,

натанік паказвае дзе ты, куды ідзеш, і адкуль.

Паўтарае найважнейшае,

дапамагае ведаць свае лічбы.

Нататнік дазволіць табе падарожнічаць у часе.

У любы момант праверыць што ты рабіў месяц ці год таму,

бачыць, як колішнія цяжкасці і боль

пераўтвараюцца ва ўспаміны і досвед,

пераціраюцца тваёй воляй.

Запісанае — паляпшаецца.

Няма іншага шляху як наперад і ўгару, калі ты запісваеш,

замяраеш, і фіксуеш свой рух.

Запісваць свае справы азначае захапляцца плынню часу.

Хто ж не запісвае нічога і ня ведае сваёх лічбаў — прыходзіць у жах ад плыні часу.



Багі хочуць каб ты захапляўся светам, а не прыходзіў ад яго ў жах.

Лішняе

Важна ня толькі што робіш, але й чаго ня робіш.

Ёсць лішнія словы, лішнія людзі, лішняе чытво, лішнія фільмы, лішняя ежа.

Усё гэта дае табе лішнія клопаты, займае розум і волю.

Часам карысна запаволіць сябе.

Менш казаць, менш удзельнічаць, аддаліцца.

Ніколі не хвалюйся, што нешта ўпусціў.

Свет бясконцы, словы, гісторыі, людзі — усё бясконцае.

Адно час і волю мусіш берагчы.

Часы на рознае

На кожны твой узрост будуць свае мэты.

Спяшайся працаваць, але не спяшайся ўкладаць вынікі сваёй працы.

Не абавязкова адразу вырасцеш у таго, кім можаш быць.

Пакуль юнак, табе цяжка прадказаць будучыню, таму ня стаў сабе далёкіх мэтаў.

Яны зменяцца й не адзін раз.

У маладосці стаў сабе канкрэтныя мэты што выводзяць цябе на новыя ўзроўні.

Простыя, вымяральныя рэчы — вага, заробак, колькасць людзей.

Мэты, што паказваюць табе твой рост і вядуць да сілы і ўпэўненасці.



Пасталееш і зразумееш, у якім кірунку ты хочаш стрэліць той сілай,

а тады і будзеш мець найвялікшы імпэт, бо ставіў мэты якія гартавалі цябе,

рыхтавалі цябе да галоўных высілкаў.

Жах і захапленне



Гэта вялікі сакрэт, пра які ты магчыма ўжо пачаў здагадвацца:

→ усё ў свеце можа выклікаць жах;

→ усё ў свеце можа выклікаць захапленне.

Прырода, плынь часу, жанчыны, справы, суперніцтва, рост, цяжкасці, перамогі –

усё, што нам патрэбнае, як паветра, –

усё *адначасова* і дзівоснае і жахлівае.

◦╳◦

Паміж жахам і захапленнем няма нават і крока.

Абодва станы нам патрэбныя, як патрэбна і быць на мяжы.

◦◦╳◦◦

Кожны напад ворага дзівосны. Кожны скарб жахлівы.

◦╳◦

Нават перамогі для людзей бываюць жахлівыя, бо парушаюць іх звыклую плынь часу.

◦╳◦

Кожная справа, якую ты робіш, можа быць то жахлівай то дзівоснай на працягу аднаго дня.

Гэта пытанне тваёй уласнай наладкі, твайго позірку.

Наладжвай сябе на дзівосы, бо так весялей.

Жах таксама патрэбны, але ён сам знойдзе чын паказацца.

◦╳◦╳◦

Калі жах пераходзіць у захапленне — гэта найлепшае пачуццё.

Гэта момант, калі ты можаш адчуць Волю, датыкнуцца да яе.

Гэта як ружовае здаровае дзіця, што раптам з’яўляецца з крыві і крыку.

Набліжэнне да Багоў.

Бо і самі Багі — адначасова і жах і захапленне.

Чорная хмара

◇\

Ёсць некалькі вельмі дзейсных шляхоў падвесіць над сабой

чорную

атрутную

хмару.

◇\

Яна будзе над табой куды б ты ні пайшоў,

сябры будуць адчуваць яе,

жанчыны будуць бачыць яе,

яна будзе псаваць справы,

ціснуць на цябе штохвіліну.

◇\

Вось самыя надзейныя спосабы:

Хлусіць

Ты можаш падмануць іншых, але не падманеш сябе. Хлусня дае пустэчу і страх.

Страх быць спайманым, страх апынуцца вінаватым, страх згубіцца.

Жыць чужым жыццём

Цела назапашвае недавер і незадавальненне калі ты жывеш не сваё жыццё.

Лепш не пачынай.

Губляць час

Усе мы ведаем што мусім рабіць, і ўсе мы ведаем што робім насамрэч.

Калі твае справы не вядуць цябе да тваёх мэтаў, яны выдуць цябе пад чорную хмару.

Спусташацца і выпальвацца

Брудныя і пустыя фільмы, мастацтва што завязана на жарсці, пустая, атрутная і саркастычная балбатня, растварэнне ў гулянках — усё гэта спусташае і выпальвае.

Не карыстацца целам

Жыць і не даваць свайму целу напругу — жахліва.

Ня ведаць, на што здатнае тваё цела — непавага да Багоў.

Нагружай цела, выпрабоўвай, дары яму рух, і яно аддзячыць добрым настроем і цьвёрдасцю.

Баяцца

Страх захінае вочы і робіць слабым.

Будзь асцярожным, але не дазваляй страху кіраваць табой і тваімі выбарамі.

Мінулае і будучыня

Помні, як бы цяжка ні было —

гэтыя часы стануць мінулым і асветляцца,

напоўняцца добрымі ўспамінамі, пахамі, гукамі,

усім тым, што ты не заўважаў у паўсядзённасці.

Будучыня зробленая з мэтаў, мараў, ці страхаў.

Мінулае зробленае з прыемнасцяў альбо шкадаванняў.

І толькі сёння, тут і зараз, ты можаш выбудаваць

прыгожую будучыню і прыгожае мінулае.

Наладжвай сябе на прыемныя мары.

Працуй на добрыя ўспаміны.

Збытак

Выкуй такі светагляд, які дае ва ўсім бачыць багацце і бясконцую плынь.

У свеце *бясконцыя* ідэі, справы, грошы, сябры, жанчыны, магчымасці.

Нішто ня скончыцца, ніякая страта не вызначае цябе.

Заўсёды будзе новае, большае, лепшае.

І ты сам будзеш новы, дужэйшы, больш дасведчаны.

Чым болей робіш — тым болей паспяваеш.

Больш бярэш, больш нясеш, маеш больш адказнасці -

значыць сапраўды раскрываеш сябе,

свае здольнасці, сваю сілу, Волю,

знаходзіш унутраныя скарбы, што продкі назапашвалі тысячагоддзямі.

Ты — сума здабыткаў тысячаў і тысячаў пераможцаў.

Літаральна ўсё можаш знайсці сам у сабе, у сваёй крыві.

Незалежнасць ад вынікаў

Рана ці позна ты зразумееш што найлепшы чын існавання —

быць незалежным ад вынікаў і ацэнак.

Ніякі адзіны вынік чагосці не вызначае твой спакой і радасць.

Чужыя словы, чужыя паводзіны, чужыя выбары;

адмова жанчыны, страта кліента, адмена падарожжа, —

Нішто гэта не скасоўвае цябе, таго чым ты ёсць,

ня гасіць твой агонь.

Выбудоўвай сваё жыццё так, каб ты не залежыў ад чагосці адзінага.

Што б ні аднялі ў цябе, пераключышся на іншае.

Падаць і ўставаць

Здараецца, што парушаеш расклад і адступаеш ад мэтаў і справаў.

Здараецца, што даеш волю слабасцям.

Ведай: ва ўсіх так.

Важна толькі як хутка ты вяртаешся на свае рэйкі.

Не пераймайся — усе адступаюцца, паслізваюцца, і падаюць.

Галоўнае ў такія моманты — ня ўкручвацца ў вінаватасць,

нянавісць да сябе, ня падаць у яму са шкадаваннямі.

Вяртайся на сцежку адразу, як толькі заўважыш што заблукаў.

Блуканні — таксама частка шляху, галоўнае хутка вяртацца на дарогу.

Калі прашляпіў у нечым адным, больш нічога не дадавай.

Вычарпай тую адну слабасць, усё аб гэтым зразумей і рухайся далей.

Калі пераеў, не сядзі ў дадатак да раніцы.

Калі з некім пасварыўся, не прапускай спорт у той дзень.

Ніхто ня робіцца таўстуном, пераеўшы *адзін* раз.

Ніхто ня робіцца жабраком ад *аднаго* згарэлага ўкладу.

Ніхто ня робіцца слабаком, прапусціўшы *адну* трэню.

Ніхто ня робіцца дурнем, праклацаўшы *адзін* дзень па навінах.

Ніхто ня робіцца п’яніцам ад *адной* гулянкі.

Кожны прыходзіць у сваё пекла праз *сістэматычнае паўтарэнне непатрэбнага*.

Людзі трапляюць туды, куды ня хочуць, калі не вяртаюцца да сваёх справаў.

Таму, як падаеш, адразу ўставай і вяртайся на шлях.

Шкадаванне сябе

Не засяроджвайся на шкадаванні сябе, яно аслабіць.

Так, табе цяжка, так, ты робіш больш за іншых,

так, ніхто не разумее, -

гэта нармальна.

У твае найчарнейшыя часы блізкія людзі будуць ведаць найменш.

У найцяжэйшыя змаганні ты будзеш *нібыта* адзін.

З найстрашнейшым ворагам ты будзеш сам-насам.

Гэта нармальна, рухайся і перамагай!

Ты адказваеш Багам і Продкам, яны ўсё бачаць і разумеюць.

Яны скіруюць твой шлях туды, куды табе трэба,

але толькі калі ты *сам* працягнеш ціснуць.

Яны заўсёды побач, і дапамагаюць тым хто імкнецца.

Праз пяць год

◇\◦/◇

Усе імкнуцца сябе натхніць добрымі вынікамі...

А ты можа калі ўяві дрэнныя?

◇\◦/◇

Што будзе з табой праз пяць год, калі зараз ня будзеш працаваць, трэніць, расці?

Як будзеш выглядаць праз пяць год, калі зараз будзеш піць, пераядаць, ня спаць?

Куды ты прывядзеш сябе?

◇\◦/◇

Зірні ў люстэрка, уяві што глядзіш на сябе праз пяць год.

Што будучы ты скажаш цяперашняму?

Падзякуеш альбо ляснеш аплявуху?

Якім ты *ня хочаш быць* праз пяць год, і што для гэтага рабіў сёння?

Павага

ᚷᚷ

Мужчыны паважаюць адзін аднаго за цяжкасці, каторыя яны прайшлі.

ᚷᚷ

Адбітак вырашаных праблем на тваёй гісторыі — тое што робіць цябе
прывабным, аўтарытэтным, дасведчаным, дужым, вольным, патрэбным.

ᚷᚷ

Ніхто не захапляецца простымі шляхамі,
лінейнага росту ня йснуе.
Простыя лініі спусташаюць,
роўныя дарогі выносяць наверх чарвей.

ᚷᚷ

Таму радуйся праблемам. Успрымай іх як паліва для твайго росту.
Ведай, што слабакам Долі не даюць цяжкасці,
і гэтак жа лёгка забіраюць у іх усё добрае.

Сутычкі з чарцямі

⁄|

Рана ці позна ты сутыкнешся з *сапраўднымі* чарцямі:

сканцэнтраваным, нелагічным, несправядлівым, спусташальным чарноццем,

калі ўсё ідзе насуперак, статыстычна незразумела,

калі не шанцуе, ламаюцца прылады, адвальваюцца людзі.

⁄|

Гэта вельмі важны, патрэбны, вырашальны час.

⁄|

Нават ані на секунду ня падай у шкадаванне сябе,

ня май нахабнасці адмовіцца,

толькі ня ў гэтыя часы!

Толькі не пад ціскам чарцей.

⁄|

Чэрці страшныя, але палохаць — гэта ўсё што яны могуць.

Ім не дазволена змяніць тваю Волю.

Перамогуць яны, толькі калі ты *сам* вырашыш адмовіцца.

⁄|

Зло ня можа нічога з табой зрабіць, пакуль ты рухаешся наперад.

Яны знікнуць, калі ты вытрымаеш іх ціск.

І ты будзеш узнагароджаны больш чым марыў.

|\

Больш за ўсё чэрці баяцца, калі ты смяешся з іх і ціснеш наперад,

калі разумееш, што іх жудасць будзе толькі ўспамінам,

калі прагнеш больш ціску, калі працягваеш свае справы.

|\

Таму, калі пачынецца чарноцце — вітай яго.

Кідайся ў бойку з ім. Усміхайся яму.

Рабі ўсё па парадку. Перамагай воляй.

|\

Толькі аднойчы трэба перажыць такія часы.

Усе наступныя разы будуць лягчэйшыя,

смяшнейшыя,

табе будзе ўсё роўна.

Ты будзеш ведаць, што ты

ніколі не абавязаны прайграваць.

|\

Ты выйдзеш пераможцам з таго боку, бо ўсе атакі чарцей сканчаюцца.

Лічбы не заб'юць цябе, сорам не заб'е цябе, словы не заб’юць цябе.

Ну а калі зламаешся пад ціскам чарцей хоць аднойчы,

калі адмовішся, пачнеш шкадаваць сябе,

сумнявацца,

страціш веру ў сябе, —

ёсць небяспека *прайграць назаўсёды*.

Бо аднойчы саступіўшы,

наступную іх атаку можаш ня вытрымаць,

яна будзе цяжэйшая *шматкроць*.

Менавіта таму і лічыцца што самазабойцы “ідуць” у пекла,

бо яны падаюць пад ціскам чарцей, аддюцца ім *назаўсёды*.

Самі вырашаюць *застацца* ў часе вечнай няўдачы.

Гарэць

◇

Ня думай толькі, што ты *заўсёды* мусіш,

ці нават зможаш,

быць у раўнавазе,

паспяваць усё, закрываць усе пытанні, быць вытрыманым і рознабаковым.

◇

Будуць часы, калі трэба гарэць толькі адной мэтай.

Адным заданнем, ня мець сілаў ані на што іншае.

Менавіта ў гэтыя апантаныя часы будуецца спадчына

для твайго імя, для тваіх нашчадкаў.

◇

Калі яно *ідзе*, — рабі.

Сачы, каб ты браў усё цалкам ад тых часоў, не марнаваў іх.

І добра харчаваў сваё цела і падладжваў дух.

Удранка

◇

Павер, з узростам усё менш бачна розніцы між мінулым, сучаснасцю, і будучыняй;

успаміны можна выклікаць да сябе, як і мары,

абраць жыць у любы час, у любым месцы.

Светлыя ўспаміны і светлыя мроі -

асвятляецца ўсё.

Напаўняй жыццё ўспамінамі а ня рэчамі.

Грошы

Выйграць ці не прайграць?

Недзе да 40 год — гуляй каб выйграць.

Пасля 40 з нечым ужо гуляй каб не прайграць, — але не раней.

Калі пачынаеш працу ў юнацтве — ня думай аб страшылках, абяцанках, пенсіях.

Імкніся збудаваць тое, што вынясе цябе наверх да майстроў.

За паўгады ўся драбяза вырашыцца і наладзіцца.

Табе трэба проста знайсці ўваход у тое паўгоддзе.

Рызыкуй і правярай ідэі хутка, пакуль ніхто ад цябе не залежыць.

Прайгравай рана, каб не баяцца гэтага.

Пераможца проста спрабуе *на адзін раз болей*,

пераўзышоўшы той страх і спусташэнне паразы.

Усё адрамантуецца калі пераможаш. Гузік, зубы, бампер, сяброўствы.

Не сядзі рамантуючы, пакуль іншыя перамагаюць.

Пераможцам дазволена і даруецца нашмат больш, чым думаюць баязліўцы.

Толькі вазьміся і перамагі. Афіна зойме твой бок.

Пазыкі

Не пазычай ні ў каго.

Не пазычай нікому.

Калі парушаеш першае правіла — аддавай як хутчэй.

Калі парушаеш другое правіла — уяві што падарыў.

Пагарда і прага

Не пагарджай грашыма.

Грошы — чын мераць энергію, высілкі, розум.

Грошы даюць магчымасць рабіць справы з большым вынікам.

Так, іх шмат у брудных, пустых, бяздушных.

Але іх шмат і ў разумных, добрых, дужых.

Грошы нічога не адчуваюць.

Уяві сабе, што думае сотка на стале аб табе. Нічога.

Гэтаксама нічога аб табе ня думае і тысяча, і мільён.

Грошы гэта проста грошы, і ты таксама будзь спакойны да іх.

Ня прагні *толькі* грошай бязмежна.

Прагні волі, хараства, гонару, радасці ад працы, дасягнення мэтаў, дапамагі годным.

Грошы патрэбныя на гэта.

Узгадай сагі - грошы і падарункі мусяць цячы вольна.

У свеце штосекундна з рук у рукі цячэ агромністая колькасць грошай.

Трэба проста стаць на адным з тысячаў тых шляхоў адным з соцень спосабаў.

Ты *заўсёды* знойдзеш новыя грошы.

Справы

Бярыся за ўсё

Калі ты малады і толькі пачынаеш — паспрабуй і цяжкую, і нудную, і брудную працу.

Укладзі тыя пару гадоў, бо заробіш досвед і аповяды на ўсё жыццё.

Глядзі навокал, разумей што табе падабаецца, а што раздражняе.

Зразумей свае лічбы, сваю хуткасць, сваю трываласць, і свой густ.

Наступныя справы абірай, ведаючы гэта.

Больш грошай не дадуць рады, калі праца не па табе.

Як станеш дастаткова суворым і патрабавальным — то і пачынай працаваць сам на сябе.

Разумей сябе

◇

Ведай свае здольнасці, і гэтак жа добра ведай свае слабасці.

Найперш рабі тое, у чым дужы.

◇

Няма людзей, аднолькава здольных да ўсяго.

Кожны вялікі, каго ты ведаеш, робіць тое, што ў яго атрымліваецца найлепш,

і пазбягае таго, у чым ён слабы.

◇◇

Гэтаксама людзі з часам знаходзяць самы прывабны свой бок,

і, фатаграфуючыся, заўсёды паварочваюцца ім да камеры.

Але ў справах часта працягваюць брацца за рэчы, для якіх яны ня зробленыя.

Хто бярэцца за справы цяжкія і нудныя для іх — потым пакутуе.

◇◇◇

Адным цяжка прамаўляць, гэта высмоктвае іх сілы і патрабуе навучання.

Іншым цяжка выдумляць і планаваць, быць сам-насам з паперай спусташае іх.

◇╳◇

Навучыся таму што табе цяжка, разумей як гэта робіцца,

але засяроджвай асноўныя сілы на тым, што робіш найлепш.

Рабі што робіцца

◇╳◇

Калі павольна ў адным, рабі іншае.

Рабі тое што *йдзе*, не чакай надвор'я.

Грошы йдуць павольна — прыйдзі ў выдатную форму, стань дужым як зубр.

Мала сяброў — вырошчвай справу, стань маяком для тваёх людзей.

Не стае жанчын — стварай музыку, пішы, малюй, здымай.

Ня ведаеш з чаго пачаць — рабі ўсё па парадку.

◇╳◇

Часы змяняюцца: спачатку адно, потым іншае.

Вынікі ў адной справе падцягваюць за сабой усё астатняе.

Зрушай і пракручвай свет сваёй воляй, як робяць Багі.

За жыццё свет паварочваецца да нас рознымі бакамі.

Хто кажа што часу мала — той проста злівае яго ў нікуды.

◇╳◇

Калі ты працуеш, усё навокал таксама працуе.

Умей казаць "Не"

◇╳╲

З часам выпрацуй свабоду і чуйку, каб казаць "не" падазорным прапановам.

Адмаўляючы, здабываеш больш.

Прапушчаныя грошы заўсёды вяртаюцца з іншымі магчымасцямі.

У той жа самы месяц, на тым жы тыдні, а часта і ў той жа дзень.

◇╳╲

Ідэі, партнёрствы, справы — бясконцыя.

Іх плынь ідзе праз сусвет і ня скончыцца на вашым вяку.

Смела адмаўляйцеся ад пошлых, непрыемных, сумнёўных, і "ну нейкіх такіх".

◇╳╲

Магчымасць адмовіць пакупніку, партнэру, або кліенту — найвышэйшая каштоўнасць, сэнс працы на сябе, і неабходнасць для заглыблення.

Пакуль ня маеш сілаў адмовіць любому — з рабства яшчэ не выйшаў.

Усё — праца

Не пераймайся, калі нехта кажа, што твае справы “несапраўдныя”.

Усё можна пераўтварыць у справу жыцця.

Калі твой занятак робіць цябе шчаслівым ды прыносіць грошы, — гэта і ёсць твая Праца.

Ня думай, што мусіш з юнацтва назаўсёды абраць працу.

Яна часта абірае цябе сама, толькі быць адкрытым, шчырым, і дысцыплінаваным.

Шмат маніпуляцыяў закладзена ў слова “прафесіянал”.

Калі нехта робіць сваю справу сумленна шмат часу і не пазычае ў цябе грошы — то й лічы яго прафесіяналам.

Слава майстра

Натуральны накірунак любой працы — стаць майстрам.

Калі рабіць што заўгодна доўга і паслядоўна, робішся майстрам.

Майстэрства — тое што будзе цябе карміць, трымаць, і весці наперад.

З часам майстэрства робіцца тваёй славай, што йдзе перад табой і адчыняе дзьверы.

Ва ўсім можна дасягнуць майстэрства, і ў любым занятку майстэрства паважнае.

Майстар любой справы ніколі ня будзе галодным, няшчасным, альбо самотным.

Прысвяці справе час

Калі незразумела, з якога боку падысці — пачні з любога і збірай інфармацыю.

Чым больш ты ведаеш, тым лепшы знойдзеш шлях.

Ва ўмове кожнай задачы — ключ да адказу,

таму ўмовы трэба ведаць на памяць.

ведай

свае

лічбы.

Не шкадуй часу, які праводзіш у працы.

Правіла, што мой бацька аднойчы сказаў:

“Кожная нармальная справа стандартна зойме адзін дзень.”

Нават калі здаецца, што яна на дзьве ці тры гадзіны.

З моманту як ты прачнуўся, да моманту як ты заснуў — ты маеш абмежаваны рэсурс волі.

Дзённую порцыю волі прысвяці адной поўнай справе, зрабі яе ад пачатку і да канца,

ды запішы ўсё аб гэтым.

Недаробленая альбо дрэнна зробленая справа псуе настрой і гонар.

Хаос і парадак

Мы зарабляем і здабываем во ўмовах непрадказальнасці, рызыкі, хаосу.

Таму ў хатніх і асабістых справах мусяць быць поўныя прадказальнасць і парадак.

У бізнэсе невядомасць і хаос — гэта магчымасці для росту.

У побыце ж непарадак і раптоўнасць — гэта цеча ў чоўне тваёх справаў.

Воля, якую ты марнуеш на хатні хаос — менавіта тая, якой табе ня стане ў справах.

Распісвай наперад, распланоўвай, аўтаматызуй, уніфікуй.

Бо з плану яно і само выб'ецца, не хвалюйся, нудна ня будзе.

Не дапамагай хаосу прыходзіць у свет, — яму цікава гэта рабіць самому.

◦◇◦

Негатыў аўтаматычны, пазітыў патрабуе высілкаў.

Як цемра заўсёды ёсць сама па сабе, а святло трэба запаліць,

так і беспарадак знойдзе свой шлях сам, а ты рупіся пра парадак.

◦◇◦

Запісвай, лічы, занатоўвай: час, грошы, размовы.

Не абавязкова адразу прыходзіць да нейкіх высноваў.

Проста ведай свае лічбы.

◦◇◦

Інтуіцыя збірае інфармацыю пакуль ты і не заўважаеш таго.

Прадказальны, распланаваны побыт пакідае інтуіцыі больш рэсурсу.

Веданне сябе і сваіх лічбаў дае інтуіцыі больш дадзеных.

Звычкі ўпарадкоўваць, планаваць, і замяраць — аптымізуюць твае высілкі.

Што гэта, як не яўная перавага?

.

Звычкі

◦╳╲◇╱╳◦

Звычкі — магутны інструмент.

Не ўскладняй і не калупайся, выпрацоўваць звычкі вельмі проста:

Два тыдні *змушай* сябе нешта рабіць, — ўсё, далей яно ідзе само.

Звычкі могуць зрабіць ці зламаць цябе, гэта ці не самае важнае.

Глядзі на звычкі іншых і супастаўляй іх з ладам і вынікамі іхнага жыцця.

Сувязь будзе паўсюль.

Адзін раіў узяць аднойчы вакацыі ад чыстай ежы.

Есці выпадковае абышто, як усе. Дзень, два, тры.

Чыпсы, маянэз, булкі, танны алей, цукеркі, каўбасы —

здаецца што гэтага хочацца калі галодны,

Але ніхто ня хоча працягваць больш за тыдзень, гэта пекла.

Зніжаюццы сілы, настрой, тупее розум, цяжэеш.

Дык вось большасць жыве ў гэтым.

Гэтаксама і ты, як выпрацуеш добрыя звычкі, ня зможаш вяртацца да абы-чаго.

Ва ўсім — у справах, адносінах, вышкалах, забавах.

Памер ўнёскаў

Цяжка гэта прыняць, але амаль нікога не цікавіць цяжар тваёй працы.

Штодзённая дысцыпліна, ахвяры, высілкі — гэта ўсе твая асабістая справа со светам.

Людзі бачаць толькі вынікі й цікавяцца толькі імі.

Асабліва тыя, хто ніколі нічога годнага не рабіў.

Не крыўдуй, калі іншым нецікава, як ты ўкладаўся.

Браты, ня мерайцеся ўнёскамі адно з адным.

Калі вырашылі рабіць нешта разам — рабіце самааддана і без падліку чужой працы.

Бо людзі мераюцца ўнёскамі, асабліва слабейшыя і дурнейшыя любяць падлічваць чужую працу.

Таму цяжкія партнэрствы.

Хіба толькі браты могуць сапраўды быць камандай.

Калі працоўныя партнэры пачынаюць мерацца ўнёскамі — бізнэсу канец.

Калі вы мераецеся ўнёскамі з жонкай — сям'і таксама канец.

Хуткасць

Ты заўважыш, што людзі рухаюцца вельмі павольна.

Павольна вырашаюцца, павольна спрабуюць,

павольна пачынаюць, доўга і нудна памыляюцца,

павольна правяраюць тое, што ты раіш ім.

Недаверліва ставяцца да сапраўднага досведу,

клеяцца да бяздзейных, пошлых, але прыемных парадаў.

Людзі рухаюцца хутка толькі калі іх змусіш,

калі зляцца,

калі зайздросцяць,

калі атрымліваюць штуршок, прыціскаюцца да сцяны, грукаюцца аб дно.

Дык вось, сакрэт хуткасці

ў тым што гэта проста *звычка*.

Карысная звычка,

і, як любую іншую звычку, яе можа выпрацаваць.

Выпрацуй звычку рухацца хутка.

Бо йначай будзеш плыць, бы смецце па рацэ,

ад штуршка да штуршка,

ад берага да берага,

куды нясе *само*.

Як нешта прыдумаў — адразу давядзі да розуму, запусці ў свет.

Запішы, выкладзі, патэлефануй, схадзі, дашлі той ліст, купі, правер.

Ня мусіць быць ідэальна, мусіць быць *збольшага гатова*, гэтага дастаткова для праверкі.

Горш за ўсё ісці далей з багажом неправераных ідэй.

Ідэі ня вартыя нічога самі па сабе, давядзенне да жыцця каштоўнае.

Чалавек багаты на ідэі але бяздзейны — бы пустэльня.

Можа яна і поўная зярняткаў там, унутры, ды нічога не прарастае.

Прафесіяналы

Колькі часу я згубіў, спрабуючы разабрацца сам у рэчах, каторыя іншым вырашыць лягчэй!



Працуй з бухгалтарам, юрыстам, майстрам.

Прафесіянал дапаможа не баяцца закрытых дзьвярэй, правілаў, ці абмежаванняў.

Ва ўсім ёсць свой свет з тысячай шляхоў, разабрацца ў каторых самому цяжка.

Ня слухай плёткі, не завязвайся на чужыя страхі;

людзі палохаюць іншых каб апраўдаць свае няўдачы.

Ня гуглі, а запішыся на кансультацыю.

Не хвалюйся заўчасна,

Стаў задачы тым, хто ведае як іх вырашыць;

калі не атрымаецца — перастаў задачы адпаведна з былымі вынікамі.

Абірай слушных прафесіяналаў, дасведчаных і спакойных.

Рабіся прафесіяналам сам і будзь майстрам сваёй працы,

Тады знойдзеш шмат новых людзей, з каторымі будзеш вырастаць яшчэ больш.

Тут ё й адваротны бок —

З ростам досведу ты станеш абазнаны ва ўсіх праблемах, што давялося вырашыць.

І адрозніваць добрыя парады ад шкодных.

Доктар, што ня жыве з тваімі асаблівасцямі, можа ня ведаць з чаго падступіцца.

Бяздзетны настаўнік са школы,

знерваваны псіхолаг што хоча каб ты працягваў “лячыцца”,

СТАшнік што першы раз бачыць тваю машыну —

Усе яны можа і прафесіяналы на паперы, але могуць ня мець аніякай карысці ў параўнанні з тваім досведам.

Абірай тых, хто дапаўняе твой досвед, а не размывае яго.

Аддавайся цалкам

Што б ты ні рабіў, нават часова, аддавайся той справе цалкам.

Таксіст?

Будзь ва ўсіх мэсенджерах, вітайся на некалькіх мовах, ведай дзе што ў горадзе найсмачнейшае, найвесялейшае, куды людзі едуць і навошта, ведай найлепшыя шляхі, давай візіткі, вазі далёка, задорага, і мякка.

Барыста?

Выглядай як барыста, рухайся як барыста, ведай усё пра каву, кавамашыны, ведай хто дзе што прадае, рамантуе і абслугоўвае, май усе кантакты і парады, ведай іншыя кавярні, разумей густы людзей.

◦╳◦

Усялякая справа, якую ты робіш тут і цяпер — твая праца.

Ты робіш яе, яна займае час твайго жыцця,

часовая ці не — але гэта тканіна твайго жыцця.

Усё часовае.

Але кожная справа, якую робіш, паказвае цябе Багам.

◦╳◦

Кожны, хто бачыць цябе на працы, можа бачыць альбо прафесіянала,

альбо абыякавага халтуршчыка.

Як лепей выглядаць?

Прафесіяналы прыцягваюць прафесіяналаў.

Вельмі шмат гісторый пачынаюцца з "яго заўважылі".

Дык выбівайся.

Жанчыны

...тут толькі два правілы:

1. *будзь прывабным;*
2. *ня будзь непрывабным.*

Прывабнасць

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Прывабнасць — гэта:

упэўненасць у сабе,

самадастатковасць,

спакой,

дасведчанасць,

таямнічасць,

дагледжанасць,

сіла і веды,

гучная ясная гаворка,

просты позірк у вочы,

усмешка,

майстэрства і лёгкасць,

свой план, свае справы.

Непрывабнасць

Непрывабнасць — гэта

шматслоўнасць,

слабасць,

залішняя адкрытасць,

прага да яе,

няўпэўненасць,

няўменне і няведанне,

недагледжанасць,

ціхая гаворка,

блукаючы позірк,

самапрыніжэнне,

жаданне ва ўсім дагадзіць,

бяладдзе ў справах,

адсутнасць мэтаў,

страх.

Чаго хочуць жанчыны

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Жанчыны хочуць:

1) рознага ў розныя дні цыклу;

2) рознага ў розныя часы жыцця;

3) самі ня ведаюць чаго.

У іх доўгі спіс патрабаванняў і правілаў, і ўсе іх яны лёгка парушаць *дзеля цябе*.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Хлопцы, што гадаюць чаго хочуць дзяўчыны і спрабуюць падладзіцца — непрывабныя.

Тыя, што йдуць да сваёх мэтаў і на шляху даюць увагу вартым жанчынам — прывабныя.

Помні аб гэтым і сам будзь мерай усяго.

Мы розныя

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Мужчыны і жанчыны — розныя істоты. І ад шыі ўніз, і ад шыі ўгару.

Жанчыны цякучыя.

Яны прымаюць формы і лягчэй прыстасоўваюцца пад абставіны, каб бяспечна вынасіць і выгадаваць дзяцей. Ім важнае ўхваленне, грамада, *нармальнасць*.

Мужчыны імкнуцца да цвёрдасці, бо створаныя каб вырашаць праблемы і воляй змяняць свет. Нам важна вынаходзіць, правяраць, прабівацца, перамагаць.

Жанчынам цяжка не прыстасоўвацца пад наваколле,

Мужчынам цяжка ня ціснуць і не прабіваць свой шлях.

Мы вельмі розныя, і кожны вольны адмаўляць гэта — але тое шлях да пакутаў.

Хаця мы і розныя, мы створаныя каб супрацоўнічаць, а не спаборнічаць.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Жанчына — брама ў свет хаосу,

і калі ты не паддаешся гэтаму хаосу —

яна хоча цябе больш і больш.

Знаёмствы і спатканні

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Знакоміцца трэба наўпрост, пазбягаючы ўсіх перашкодаў да простай гаворкі.

Жанчыны жывуць у сумнёвах большасць часу,

І лішнія сумнёвы аб табе — ніколі не карысныя ані табе, ані ёй.

Забяры ў жанчыны час і магчымасць сумнявацца падчас размовы з табой — і супакоіш яе.

Знаёмствы ў інтэрнэце ж завязаныя на сумнёвах, бо даюць ім бясконца перабіраць, ад чаго яны самі і скісаюць.

Адзіны варты ўжытак для інтэрнэту — як мага хутчэй дамовіцца аб спатканні.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Лепш знаёмся *толькі* з тымі, хто выказвае знакі інтарэсу.

Самы верны і просты знак зацікаўленасці — хуткі паўторны позірк.

Жанчыны сканююць людзей нон-стоп, імгненна ацэньваючы цела, адзенне, рухі, характар, твар.

І калі, прабегшы па табе позіркам, яна раптам затрымліваецца і глядзіць на цябе *яшчэ раз* —

ты мусіш проста там падысці і сказаць "вітаю", гэта найлепшы час і найлепшы пачатак, заўсёды і паўсюль.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Падысці і загаварыць умомант — гэта найлепшае што ты можаш зрабіць,

бо такое доўгачаканае, прыроднае, і такое нязвыклае сёння.

Бо стварае вокаймгненнае напружанне, а напружанне ўзбуджае.

Напружанне сітуацыі + твой спакой = прывабнасць.

Любы, хто мае смеласць і абыякавасць падысці і пачаць размову — вырастае ў яе вачах,

бо робіць што хоча і йдзе куды жадае.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Чым больш размаўляеш, гуляеш, і стасуешся з жанчынамі,

тым ахвотней з табой бавяць час новыя.

Чужы інтарэс і запатрабаванасць адчуваюцца, і яны страшна прывабныя.

Таму ў пэўны момант трэба недзе пачынаць.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Ня бойся яе прыгажосці.

Яна такая як ёсць, і жыве з сабою ўсё жыцце,

сама для сябе яна — звычайная.

І ты стаўся проста і роўна нават да самай прыгожай.

Гаворачы, гавары проста. Гавары з чалавекам.

Згубіўшыся ў яе прыгажосці — згубіш яе інтарэс.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Калі з жанчынамі — проста весяліся ўнутры. Гэта самыя прывабныя паводзіны.

Жартуй, радуйся, танчы па-над усім, ступай з лёгкасцю.

Ня ўкопвайся ў спрэчкі, разборкі і дэтальныя аповяды, не даследуй, не вучы.

Усё заўважай і на ўсё май адказ калі спытаюць, але найперш проста *добра баў час*.

Як вярнуць дзяўчыну

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Ніколі нікога не вяртай.

Асобны, дарослы чалавек самастойна вырашыў ад цябе адмовіцца...

Што менавіта ты хочаш вярнуць?

Свае ўяўленні пра яе, свае мроі і планы, свой ідэал.

Але ж ты тут і нікуды не сыходзіў, і твае мроі з табой, —

то й вяртаць няма чаго.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Калі яна сышла, ты альбо ніякі сам па сабе,

альбо яна ня бачыць і не разумее тваю каштоўнасць.

Што б там ні было, табе побач не патрэбнае гэта.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Той, хто трымаецца за жанчыну з усяе сілы, паказвае што ў яго зараз няма нічога большага ў жыцці.

Але жанчына *ня хоча* быць найбольшай тваёй справай.

Гэта палохае яе, і можна зразумець чаму.

Вяртаць жанчыну — непрывабна.

Людзі без варыянтаў — непрывабныя.

Жанчына знішчыць цябе за непрывабнасць, і выставіць вінным.

Ты і праўда будзеш вінны ў тым сам.

Тая самая

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Няма "той самай" — ёсць дрэнныя і ёсць добрыя.

Жанчына — прыемны і неабавязковы дадатак да жыцця, а не яго цэнтр.

Мець жанчыну — ня *права*, і ніколі не было ім.

Узгадай казкі — толькі героям і пераможцам даюцца найлепшыя жанчыны.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Лад з жанчынамі — гэта проста працяг ладу ва ўсіх іншых справах.

Калі ў цябе ня так, то ты ў слабай пазіцыі.

Людзі ў слабых пазіцыях непрывабныя.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Згубіўшы каханую першы раз я думаў: "*такога* я ні з кім не змагу мець!"

І наступны раз думаў гэтаксама.

А потым перастаў, бо зразумеў, што кожная мая наступная дзяўчына — менавіта такая, якая патрэбная мне, і тая, якой я варты.

А я такі, які патрэбны ім.

Рамантаваць адносіны

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Сапсаваныя адносіны нельга адрамантаваць.

Лепей даваць першы шанец новым людзям, чым трэці ранейшым.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Як бы файна вы ні замірыліся, тое з-за чаго вы сварыліся — па-ранейшаму там.

Пройдзе час па замірэнні, пройдзе наступны "мядовы месяц" — і вы з ёй зноў апынецеся ў тым жа самым месцы, дзе былі.

Няважна, праз год, пяць, ці дваццаць, але ўсё яно там, і ўсплыве зноў.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

І калі праз гады ты атрымаеш ад яе тое ж, што меў і раней,

тое, што бачыў адзін раз,

тое, чаго так засцерагаўся ўнутры —

ты зразумееш, якім быў дурнем, калі вяртаў яе і спадзяваўся на змены.

Будзе дужа шкада змарнаванага часу.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Хочаш даць другі шанец, чалавек сапраўды схапіўся?

Трэба пільна сачыць: наколькі яна асэнсавала свае памылкі?

Як моцна працуе над сабой каб палепшыцца?

Ці не зашмат сілаў *ты сам* кладзеш на падладжванне?

Вельмі рэдка людзі мяняюцца.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Праз год табе будзе сорамна за кожнае паведамленне што ты ёй даслаў.

І за гэтае таксама.

Ніколі не пішы і не тлумач больш за яе.

Для нас і для іх

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Прыродныя наступствы сэксу для жанчынаў — цяжарнасць, боль, аслабленасць, зменена назаўсёды цела, залежнасць на гады.

Прыродныя наступствы сэксу для мужчынаў — млявасць, хіне ў сон.

У нас у гэтым *вельмі* розны памер рызыкі.

Разумей гэта і не крыўдуй ні на што.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

У мужчынаў прадукуецца ў 17 разоў больш тэстастэрону, каторы адказвае за сэксуальнае жаданне.

Так, як яны *хочуць* у авуляцыю, — мы *хочам* штодзённа,

толькі ў 17 разоў мацней.

Найразумнейшыя з жанчынаў усведамляюць гэта.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Жанчыны амаль ня спяць з тымі да каго не маюць пачуццяў. Мужчыны? Лёгка.

Пра кожнага каханка здаровая жанчына думае што ён, магчыма, "той самы".

Вельмі рэдкія жанчыны могуць проста спаталяць жаданне, як мы.

І тыя з іх, хто паводзіць сябе “па-мужчынску” ў гэтым, звычайна няшчаснеюць,

бо выпальваюць унутры сябе прыродную здольнасць прывязвацца.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Прыродная мэта жанчыны — зацяжарыць ад *найлепшага*.

Прыродная мэта мужчыны — апладніць *як мага больш*.

Гэтая супярэчнасць *ніколі* не ўлагодзіцца.

Мы маглі б усе быць зробленыя гермафрадытамі, але мы двуполыя, + ды ◯.

Менавіты гэты падзел і робіць наш свет дзівосным:

⊕

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Памятай гэта заўсёды, толькі бяз спрэчак альбо лекцый.

Розныя інструмэнты, розныя мадэлі, розныя шляхі, розныя наступствы, розныя прыярытэты.

Але — агульная мэта: падоўжыць род новымі дужымі мужчынамі і клапатлівымі жанчынамі,

у каторых мы перараджаемся пасля жыцця дасягненняў і перамог.

Гэта дзівосная задача, і ты тут у тым ліку, каб яе вырашыць.

Вернасць

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Калі ты верны да вартых — ты зарабляеш гонар для нашчадкаў.

Калі ты верны да тых хто выказвае непавагу — ты марнуеш гонар продкаў.

Каб трапіць так блізка да цябе, яна мусіць даказаць сваю вартасць.

Згаджайся на адносіны толькі тады, калі яна аб іх марыць і працуе на цябе і твае мэты.

Ніколі не змушай да адносінаў і не пераконвай.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Даеш сваю вернасць адной ці маеш некалькі — гэта твой выбар.

Але мы наўрад ці створаныя, каб жыць адной парай усё жыцце,

да гэтага можна толькі змусіць, застрашыць, зманіпуляваць.

У любым выпадку — падманваць нельга, бо падман марнуе гонар.

Будзь заўсёды шчырым і дамаўляйся наўпрост.

Самая вартая можа быць найбліжэйшай, але не абавязкова мусіць быць адзінай.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Самая важная парада тут — пільнуй свае межы.

Ты пазнаеш момант, калі яны парушацца.

І тады пытанне да цябе: як сталася што гэты чалавек патрапіў так блізка?

Толькі ты ў гэтым вінаваты,

фільтруй наступных лепш і трымай далей.

Не марнуй сілы

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Калі цалкам укладаешся ў жанчын — згубіш і справу і жанчын.

Калі цалкам укладаешся ў справу — збудуеш справу і здабудзеш жанчын.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Абірай тых, хто абірае цябе.

Зразумей якому тыпу жанчын падабаецца твой тып,

І табе хопіць іх на ўсё жыццё.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Канешне, ты можаш атрымаць любую.

Але які будзе кошт і колькі сілаў будзе марнавацца на гэта?

Сілаў, што маглі б ісці на справу.

Партнэрства з жанчынай мусіць залагоджваць цябе.

Здымаць тваю вастрыню, дадаваць прыемнасць у дні.

Гэта ня месца для пастаяннага змагання, бо табе хапае яго ў справах.

Калі ты змагаешся ў адносінах, ў справах ты будзеш слабы і паслухмяны.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Заставайся прывабным з часам; не рабіся непрывабным.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Толькі адно паважаюць абсалютна і безумоўна

ўсе жанчыны любых густаў і культур, паўсюль і заўсёды:

калі гарыш сваёй справай І разумееш,

што ў любы час можаш альбо без жанчыны,

альбо знайсці новую.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

Гэтыя правілы ўсе вельмі простыя, і ўсе згаджаюцца калі іх чуюць.

І гэтак жа ўсе іх парушаюць.

І я парушаў, і ты парушыш.

Галоўнае памыляцца хутка і з найменшымі наступствамі.

Супольства

Сябры

Ты такі, якія твае пяць сяброў.

Сябруеш з пяццю алкашамі — будзеш шостым.

Сябруеш з пяццю хэйтэрамі і гультаямі — будзеш шостым.

Сябры воляй змяняюць свет вакол сябе — будзеш і ты мацнець і рухацца да мэтаў.

Спраўджвай, а ці размаўляеце вы пра далёкае, багатае, высокае, светлае, натхняльнае?

Пра грошы, што цякуць навокал? Пра гартаванне цела і розуму?

Сцеражыся — а ці не абмяркоўваеце вы іншых увесь час?

Ці ня кпіце пастаянна, ці не існуеце ў сарказме?

З занудамі і дробнымі людзьмі марнуеш гонар, магнетызм, прывабнасць.

Трымай людзей на дыстанцыі пакуль яны не дакажуць вартасць — ветліва і цвёрда.

Сябруй вакол справаў а не вакол словаў.

Калі нехта падскоквае да твайго сябра і б'е, то ты ў той жа момант б'еш нападніка ў адказ.

І толькі потым пытаешся "хто гэта" і "што здарылася".

Проста, але ў нашыя часы гэта трэба пісаць.

Не "сябруй" з жанчынамі.

Калі хочаш яе — шчыра падкаці, а як адмовіць — падзякуй, ды йдзі далей.

Жарслівае напружанне між вамі —

самы моцны прыродны чыннік, яно нікуды не падзенецца.

Адзін з вас будзе думаць што мае *сябра,*

Іншы будзе мець спадзевы на блізкасць.

Гэта можа аслабіць у непатрэбны момант.

Былая жанчына сябра для цябе — таксама ніхто.

Роўнасць

Тыя, хто кажа, што ўсе людзі роўныя — яны ўвогуле бачылі людзей?

У няроўнасці харaство свету.

Усе мы няроўныя — і вышынёй, і шырынёй, і розумам, і схільнасцямі, і густамі.

Таму кожны мусіць дбаць аб тым, каб рабіць *сваё*, тое ў чым мацнейшы.

І стасавацца з іншымі трэба гэтаксама, памятаючы пра іх слабасці і перавагі.

У тваёй камандзе мусяць быць людзі розных шляхоў і талентаў.

Гутаркі

Не спяшайся гаварыць.

Заўсёды кажы трошкі менш чым трэба.

Калі хочаш узмацніць свае словы — запаволь іх.

На некаторыя рэчы лепш не адказваць увогуле.

Давай людзям высрацца,

хай іх словы вісяць у паветры,

ходзяць за імі паўсюль,

вызначаюць і фармуюць іх, —

паглядзі як на іх уздзейнічае тое, што яны кажуць, калі іх не спыніць.

Сорам

Як даць рады раптоўным успамінам, ад якіх робіцца

шчымліва сорамна, брыдка, альбо сумна?

Ніяк, гэта частка жыцця.

Калі маеш сорам — радуйся, бо маеш жывы дух.

Палову людзей нічым не закранеш, нібы няма ў іх таго агеньчыка.

Бессаромныя здаюцца можа й цвярдзейшымі на зямлі,

але гэтаксама нерухома стаяць платы і сцены,

пакуль навокал растуць, квітнеюць, ападаюць, і зноў вырастаюць лозы і дубы.

Утвараюць лясы, запаўняюць і аздабляюць прастору, перасоўваюцца.

А платы гніюць, сцены сыпяцца на адным месцы.

Усё ў галаве

Як трымаешся, так людзі і бачаць цябе,

абсалютна ніяк інакш.

Тое, што бачыш у люстэрку — тое бачаць і ўсе.

Трымайся роўна, проста, светла, чыста.

Ніхто ня бачыць твае думкі, сумнёвы, тваю гісторыю, твае былыя няўдачы,

ніхто не залазіць далей чым ты запусціш,

ніхто не чытае твае шкадаванні ці твой сорам.

Таму — паказвайся такім, якім хочаш быць.

Гэтак жа і ўнутры кожнага на тваім шляху

накідана памылак, шкадаванняў, слабасцяў.

Разумей, што ў любы момант любы чалавек навокал

можа з нечым змагацца ўнутры.

Дарэчы, і асноўныя бойкі — у цябе ў галаве.

Самые цяжкія змаганні — з самім сабой,

з перашкодамі што ты назапасіў у сваіх звычках, страхах, перакананнях.

Рэпутацыя

Твая слава ідзе перад табой.

Беражы сваю рэпутацыю, выбудоўвай яе.

Нехта можа цябе не любіць альбо баяцца —

Больш істотна каб паважалі тваё слова і твае межы.

Адлегласць

Добры інструмэнт для стварэння павагі — пільнаванне сваёх межаў.

Трымай людзей на адлегласці, і дазваляй набліжацца толькі тым хто дакажа вартасць.

Эксклюзіўнасць ад слова *выключэнне*.

Спачатку выключы *ўсіх*, а потым паступова дадавай найлепшых.

Каго пускаеш заблізка — робішся залежным ад таго што ён кажа і робіць.

Не давай таго ўплыву нявартым.

Прамыўка

Прапаганда ідзе паўсюль і заўсёды, і працінае ўсе супольства людзей.

Усе гурткі, суполкі, справы, фірмы, кнігі, усё што ты глядзіш, слухаеш, і чытаеш.

Нават дызайн і стыль ёсць ідэямі, што ўплываюць на жыццё.

Ніхто нічога ня кажа, не дае, і не паказвае *проста так*.

Ва ўсяго ёсць мэты, нават калі людзі самі іх не ўсведамляюць.

Пазбегнуць прапаганды немагчыма,

яе проста трэба бачыць і сведама жыць у ёй,

а таксама грунтавацца на *сваёй* прапагандзе.

Калі ты сам не наладзіш сябе, цябе наладзяць іншыя,

і ты ня будзеш шчаслівы там, куды цябе гэта прывядзе.

Таму — выпрацуй *сваю* прапаганду, *сваю* наладку,

наладжвай сябе штодзённа,

Ведай, куды йдзеш, і што для гэтага трэба рабіць.

Заўсёды пытай сябе, ці адпавядае тое, што робіш,

тваім мэтам, каштоўнасцям, стылю.

Чужыя думкі, словы, і звычкі для цябе ня значаць анічога.

Зайздрасць і злосць

Зайдзрасць ня мае розуму, аднак яна часам дакранаецца да ўсіх нас.

Калі зайздросціш некаму, адкажы на пытанне —

ці хацеў бы з ім *цалкам* памяняцца жыццём?

Атрымліваць як ён, працаваць як ён, пакутаваць як ён,

пражываць ягоныя здрады і няўдачы?

Мець ягоныя ўспаміны, згубіўшы ўсе свае; яго кроў, яго звычкі, яго густ?

Канешне ж, не.

Зайздрасць аслабляе.

Але яе можна перакаваць у злосць.

Злосць можа рухаць і натхняць.

Злосць з таго што ты разумнейшы, але маеш менш грошай;

што ты мацнейшы, але не перамог;

што ты прыгажэйшы, а маеш менш жанчынаў;

што ты больш дасведчаны, а слухаюць чужую пустэчу.

Злосць дзейная і эфектыўная, калі яе запускаць у халодную галаву.

Вельмі карысна раззлавацца і ўзяцца за працу.

Зайздрасць жа не дапаможа ў працы, яна можа толькі раз'есці цябе.

Раззлуйся, маючы цяжкасці.

“Няўжо такая дробязь прыцісне мяне долу?”

Людзі ня бачаць працу, якую ты ўкладаеш, і не цікавяцца ёй.

Людзі бачаць толькі твае вынікі, і гэта засціць ім вочы.

“Табе проста пашанцавала” скажуць яны,

крэслячы твой пот, кроў, слёзы, і тысячы гадзін працы.

Гэта нармальна, не крыўдуй.

Так, табе пашанцавала,

бо ты *хацеў* каб табе пашанцавала і Воляй ішоў да гэтага.

З боку нават я здаюся некаторым ідэальным, але маё жыццё поўнае памылак,

каторыя робяць мяне тым, кім я ёсць.

Нехта мне зайздросціць, але ў той жа час кпіць з маёх памылак.

Але мае памылкі далі мне мае ж скарбы.

Зайздрасць — эмацыйная праява неразумення.

Вырастанне

Шмат тых, з каго смяяліся і кпілі ў юнацтве, выбудавалі выдатнае жыццё для сябе.

Па сваёх правілах, адпаведна сваёх мэтаў, поўнае і шчаслівае.

Шмат тых, кім захапляліся ўсе дарослыя навокал,

выраслі ў нядзейных, баязлівых, невынаходлівых, нешчаслівых.

Пільна сачы за сабой калі ты golden boy.

Свой шлях

Не саромейся і не засмучайся ні ад чаго, што робяць іншыя.

Людзі часта пускаюць пыл у вочы, робяць карцінкі з сябе.

Нехтае мае ўсе грошы на свеце,

але ніяк ня можа — і *ніколі ня зможа* —

выклікаць *сапраўдную* павагу жанчын.

Нехта мае ідэальную постаць, рост, і гору цягліцаў,

але ніяк ня можа абраць справу і сканцэнтравацца на ёй.

Нехта лёгка знаёміцца і заўсёды ў цэнтры ўвагі,

але ніколі ня думае сваёй галавою і ня можа быць адзін ані дня.

Нехта выступае паўсюль з прамовамі

аб рэчах, пра каторыя насамрэч

мае неглыбокае уяўленне.

І штодня баіцца, што ягоны падман высветліцца.

У кагосці прыгажэйшыя фотаздымкі;

у кагосці *нібыта* больш сяброў, —

нішто з гэтага не вызначае *твой рух* да *тваёх* мэтаў.

Ты здзівішся, калі адкрыеш, наколькі можна быць незаўважным

і ўсяму даваць рады.

Здзівішся калі ўбачыш,

на якіх дробязях людзі робяць вялікія грошы,

альбо ў якім адзенні знаёмяцца з прыгажунямі.

Не забывай — усё ў тваёй галаве.

Калі ты шчыра верыш, што варты чагосці, ўсе навокал таксама так лічаць.

У свеце незлічоная колькасць *тваёх* людзей,

тых, што абяруць цябе з тысячаў, і будуць камфортна пачувацца побач.

Ты ідзеш па сваім шляху, не па маім альбо яшчэ чыім.

Дараванне

Памылкі можна дараваць адзін раз:

шчырыя памылкі з недахопу ведаў.

Калі чалавек робіць тое ж самае зноў — гэта ўжо яго свядомы выбар.

Ведаючы, што ты даруеш, ён ня спыніцца.

Пра дараванне шмат кажуць, але яго не йснуе.

Як яно ўвогуле мусіць працаваць?

Вось нехта нехта робіць табе нядобрае.

Потым кажа "даруй мне".

Што адбываецца далей?

Ты забываешся што гэта адбылося?

Проста, фізічна, выціраеш з памяці?

Гэта немагчыма, мінулае заўсёды між вамі.

Вы робіце далей выгляд што гэтага не было?

Працягваеце размаўляць, мець справы, усё як раней. Магчыма?

Ну так, калі няма самапавагі, калі інстынкт самазахавання прыглушаны нечым.

Гэта вельмі дзіўна ўладкавана -

бессаромныя людзі, што ніколі ня маюць згрызотаў —

лепшыя для стасункаў за тых, хто робіць зло і пастаянна просіць прабачэння.

Бо мы ведаем чаго ад першых чакаць і адразу ставім іх на адлегласць.

А калі запускаем назад тых каму “даруем” мінулае — гуляем супраць сваёй будучыні.

Людзі, што зрабілі табе зло,

будуць нянавідзець цябе яшчэ больш,

калі ты прабачыш іх і дазволіш далей быць побач.

Іх будуць мучыць і ўласная драбнота, і твой веліч.

Таму — ня думай зашмат аб дараванні.

Гэта ўсё ані добра, ані дрэнна, — пустое скалананне паветра.

Пільнуй межы і давай набліжацца толькі вартым.

Ворагі

◇/◇

Так ці іначай, але людзі заўсёды будуць варагаваць.

І ў цябе будуць ворагі:

альбо з зайздрасці,

альбо з прыроднай злосці,

альбо з поўнага несупадзення энергіяў.

◇/◇

Ня трэба 24/7 без выходных быць камусьці адкрытым, пастаянным ворагам.

Не давай ім такой раскошы і такой празрыстасці.

Бо будзеш для іх цалкам зразумелым і прадказальным.

◇/◇

Часам лепш наадварот, даваць ворагу дзейнічаць,

ды назіраць як ён робіць памылкі і закопваецца ў іх.

◇/◇

Дбай аб сваёй бяспецы, аб дыстанцыі, расплануй да канца,

і паступова зрабі так, каб вораг ня мог зрабіць табе аніякага зла.

Перш за ўсё зрабі гэта наладкай свайго жыцця і працы,

Цябе мусіць быць немагчыма падлавіць, спусташыць, абнуліць.

Гатовы да ўсяго і паўсюль.

◇/◇

Канкурэнты — ня ворагі.

Вы проста граеце на адным полі па адных правілах і хочаце здабыць адное і тое ж.

Спаборніцтвы ўсе часовыя.

Канкурэнту цікава абысці цябе ў нечым,

вораг жа хоча каб ты *пакутаваў*.

◇/◇

Помні, што марнаваць высілкі і час трэба толькі на годныя бойкі.

Сярэднія

◇╳◇

Усё ў грамадстве разлічана на сярэднячкоў.

◇╳◇

Глупа імкнуцца *стаць* сярэднячком —

імі робяцца ўсе *самі і так,* калі ідуць па гатовых шляхах.

Імкніся стаць адметным, выбітным,

стаў высокія мэты, такія што палохаюць і бянтэжаць цябе.

Заўсёды цаляеш высока а трапляеш трошкі ніжэй.

◇╳◇

Таму імкніся да немагчымага, неверагоднага, звышасаблівага.

Акрамя звычайных, сярэдніх, ва ўсім ёсць тысячы іншых шляхоў.

◇╳◇

Не палохайся правілаў.

Правілы пішуцца, зноў-такі, для сярэднячкоў.

Правілы змяняюцца, калі змяняюцца абставіны і людзі.

Штурхай наперад і знойдзецца шлях, чын, магчымасць.

◇╳◇

Мне мой тата заўжды казаў перад іспытамі:

“Гэта ўсё разлічана на сярэдняга чалавека. Сярэднячкі могуць, і ты зможаш тым больш”.

◇╳◇

Калі пераймаешся, а ці варты ты чагосці, — паглядзі навокал.

Хто калі ня ты?

Гультаі, таўстуны, загонныя, бязглуздыя, марудныя?

Толькі пяць чалавек на сотню знойдзеш дзейных, разумных, надзейных.

Не хвалюйся аб суперніцтве.

Скарбаў хапае на ўсіх хто за імі выпраўляецца, бо большасць ніколі і не спрабуе.

Мы ня верым у тое, ня верым, што большасць людзей слабыя, баязлівыя, нелагічныя.

А яны ёсць такімі, і чым хутчэй будзеш гэта ўлічваць — тым лепш.

◇╳◇

Сярэднячкі бачныя адразу —

Яны здаюцца галоўнымі, вызначальнымі, хоць гэта й ня так.

У любых масавых справах яны на паверхні, гучнейшыя за іншых

У суполках, алгарытмах сацсетак, на сходах, у любых гуртах —

Ты адразу бачыш і чуеш менавіта сярэднячкоў.

◇╳◇

Грамадскае абурэнне, захапленне, злосць, цкаванне, енкі, —

усе гэтыя простыя рэфлектыўныя пачуцці агучваюць менавіта сярэднячкі,

аздобіўшы пошласцю і плыткасцю.

◇╳◇

Не далучайся да натоўпаў сярэднячкоў у іхным абурэнні ці захапленні.

Не яднайся з імі ані ў нянавісці ані ў любові да чагосці.

Вельмі часта трэба рабіць адваротнае ад таго, што робяць сярэднячкі.

Яны нічога не ствараюць і не выдумляюць, толькі падхопліваюць і разносяць.

◇╳◇

Будзь абачлівы з натоўпам.

Выбудоўвай жыццё так каб гэты натоўп ня меў над табой улады, ня мог ані ўзвысіць ані забіць.

Дурні

Апроч сярэднячкоў, побач трапляюцца і сапраўдныя дурні.

Калі здаецца, што нехта дурань, — назірай за ім.

Аналізуй ягоныя звычкі, словы, выбары. Шмат можна вывучыць.

Дурні ня слухаюць разумных.

Гэта іх асноўная рыса.

Слухаюць дурні іншых дурняў, пошлых, хлусоў, сярэднячкоў.

Ніхто з нас нават ня можа ўявіць наколькі глупа мысляць дурні.

Мы думаем, што яны маюць нашую логіку і проста тугаватыя,

але яны ўласна *мысляць па-дурному*.

Трэба свядома папрацаваць калі хочаш паглядзець на свет вачыма дурня.

Кіруюць няздольныя

Адзін з парадоксаў сучаснага свету — тое, што амаль паўсюль кіруюць няздольныя,

недасведчаныя, слабыя, палахлівыя, недальнабачныя.

Уладу маюць у асноўным тыя, хто ніколі б сам яе не здабыў у змаганні.

Годны чалавек наверсе нейкай структуры гэта выключэнне а не правіла.

Справа ў тым якія марудныя і прадказальныя шляхі туды “наверх”:

нецікавыя людзям дзейным, смелым, адважным і добразычлівым.

Такім цікавейшае — рабіць сваю справу, перамагаць, вынаходзіць, выпрабоўваць сябе, вырошчваць сваіх людзей.

Будучым кіраўнікам жа цікава каб іх праўдамі і няпраўдамі хвалілі, заўважалі, прапускалі без чаргі.

Вырастаючы, ты заўважаеш, як у афіцыёзныя, зарэгуляваныя, працэдурныя структуры ўваходзяць тыя, хто баіцца самастойнасці, рызыкі, нявызначанасці, змагання,

і ўсіх іншых Дзівосаў свету, так любых нам.

Не чакаць нічога

Вельмі важна для ўнутранага ладу і здароўя думак -

нічога не чакаць ні ад каго.

Найбольш важна не чакаць ухвалення, увагі, прызнання, быць заўважаным.

Бо калі чакаеш — пачынаеш залежыць ад таго, чым не кіруеш сам.

Ты не кіруеш іншымі людзьмі, іх думкамі, і словамі.

Калі чакаеш ад іх нешта, то маеш пастаянны клопат —

а яны могуць быць няўважлівымі

або дробнымі людзьмі, або зайздрослівымі,

або проста думаць аб сабе і сваіх справах.

Атрымаеш расчараванне, апусцяцца рукі.

Лепш чакай ухвалення ад сваёх справаў і лічбаў.

Стаў мэты, ідзі да іх, і замяраў усё на шляху.

Лічбы паляпшаюцца — ты ўсё слушна робіш.

Не паляпшаюцца — разумей чаму і мяняй.

Палітыка

У палітыцы два кшталту людзей — апартуністы і фанатыкі.

Другія з часам пераўтвараюцца альбо ў першых, альбо ў герояў;

альбо выпальваюцца і чыняць дарагія памылкі.

Прафесійныя палітыкі — бы мухі, што выраслі з малых апарышаў:

старостаў, ахоўнікаў, актывістаў.

Палітыка гэта свет пошласці.

Звычайна, толькі лакальная палітыка можа ўтрымліваць добрых людзей.

Мясцовае кіраванне, дбанне аб сям'і, вуліцы, вёсцы — гэта яшчэ цікава годным.

Але змаганне са злом — вышэйшае за палітыку.

Змагацца са злом трэба, калі адчуваеш сілу ды іскры Багоў.

Змаганне са злом прываблівае чыстых людзей,

а калі яны перамагаюць, наверх выплываюць чэрві.

Гэта вечны працэс, і памятай пра яго заўсёды.

Вяртайся да сваёх справаў і мэтаў пасля ўсіх войнаў.

Калі ты несамастойны, ня маеш грошай на свабоднае перасоўванне,

Не вырашаеш сам, якім будзе кожны твой дзень,

Слабы і тлусты, ня маеш жанчын што ўлагоджваюць тваё жыццё —

Палітыка не для цябе.

Яна запаволіць цябе яшчэ больш,

Пераўтворыць у цалкам залежную, эмацыйную, слабую істоту, забрудзіць твой дух.

Кар'ера

Што людзі навокал укладаюць у тое слова?

Грошы, славу, майстэрства, прызнанне?

Але ж тыя словы ўжо існуюць, нашто пладзіць новыя?

Вельмі часта, каб прасунуць нейкія свае інтарэсы, нешта прадаць.

Цябе вызначае не “кар’ера” а сукупнасць вынікаў тваёх справаў.

Ня думай аб кар’еры, думай аб сваіх мэтах і шляхах да іх.

Думай аб тым як дапамагаць людзям і браць за гэта грошы.

Не рабіся закладнікам чагосці выдуманага.

Толькі канкрэтныя, зразумелыя мэты і дзейныя шляхі да іх.

Ёсць багатыя, але нявольныя;

Ёсць знакамітыя, але бедныя і завязаныя;

Лепш думай аб тым, што патрэбна *табе* для шчасця, і ідзі да таго.

Вельмі часта людзі нявольныя, бяздзейныя, амаральныя, і невынаходлівыя

маюць нібыта бліскучыя “кар’еры”,

Але існуюць у няўпэўненасці і нянавісці да сябе.

Калі твая дзейнасць ня мае бачнага выніку, ня бачны прыбытак, карысць для людзей, то тая праца можа і ня ўзвысіць.

Глыбока непрыемна залежыць ад чужых вырашэнняў, залежыць ад сваёй “кар’еры”.

Людзям, што залежаць ад чужога ўхвалення, фінансавання, і загадаў

цяжэй за іншых датыкнуцца да дзівосаў свету.

Дзеці

◇◇◇◇◇◇◇

Ты заробіш цалкам заменныя грошы ў любы час.

Іншыя таксама іх заробяць; грошы сто разоў памяняюць рукі,

пабудуць і тваімі, і не тваімі.

Але ніхто ня зробіць, ня выгадуе, і ня выхавае *тваёх* дзяцей за цябе.

◇◇◇◇◇◇◇

Гэтаксама як няма *ідэальнага* часу

каб пачаць развіваць сваю справу —

Няма й *ідэальнага* часу каб нараджаць дзяцей.

Калі Багі даюць дзяцей, тады і мусіш брацца і расціць іх.

Нічога няма важнейшага за працяг і ўзмацненне сваёй крыві.

Добра растуць дзеці і ў маладых бацькоў, і ў сталых.

Але Багамі задумана што найлягчэй нараджаюцца дзеці ў маладых людзей, —

то й вырасціць дзяцей маладыя цалкам здольныя.

Збольшага, дзеці растуць самі, такімі, якімі ім наканавана стаць Долямі.

◇◇◇◇◇◇◇

Бяздзетныя думаюць, што дзеці толькі адбіраюць сілы, але гэта ня так.

Дзеці даюць ідэі, натхненне, новыя веды пра свет.

Дзеці даюць досвед і пацвярджэнне здагадак.

Немагчыма назіраць больш, назапашваць больш досведу, і пры гэтым пакутаваць.

Абсалютная большасць людзей

Ня зробяць нічога цікавейшага за новых людзей.

Памнажэнне — цуд.

◇◇◇◇╳◇◇

Ня думай што нейкія твае супер-важныя планы папсуюцца тваімі дзецьмі.

Пустыя і паверхнасныя планы, безумоўна, папсуюцца,

ну то й навучышся размяркоўваць час на важнае.

◇◇◇◇◇╳◇

Дзяцей трэба адразу нараджаць як мага больш.

Дзеці ўсе розныя, і калі маеш некалькі ды назіраеш іх рознасць -

усе маюць менш ціску, больш волі вырасці сабой, менш атрутных спадзяванняў.

Вырошчваць дзяцей — цяжкая і годная справа.

Час ідзе ўсё адно, і гэтую справу лепш рабіць з найвышэйшай аддачай.

Агульная справа

◇╳◇╳◇

З усімі людзьмі навокал ты супадаеш у нейкіх справах.

З адным у працы, з іншым у спорце, з трэцім у творчасці або ў рыбалцы.

Ясна разумей, *вакол чаго* вы стасуецеся і сябруеце.

Калі здаецца што вы стасуецеся “проста так” — гэта ўсё роўна вакол справаў.

Проста тыя справы бываюць такія дробныя што не заўважаеш іх.

Пляткарыць, ленавацца, спальваць грошы — таксама “справы”, але яны забіраюць сілы,

даюць пустэчу і жах ад плыні часу,

і сяброўствы гэтыя спусташаюць.

Ня бойся адразаць людзей, з якімі ня дзеліш годных справаў.

◇╳◇╳◇

Вельмі асцярожна слухай чалавека з адной справы аб іншай.

Той, з кім ты ловіш рыбу, можа не разбірацца ў бізнэсе.

Той, з кім зарабляеш грошы, можа не разумець як сачыць за целам.

Гэта нармальна!

Дзяліся досведам і бяры чужы досвед, але глядзі адкуль ён ідзе.

Stay in the game

Ты атрымаеш велізарную перавагу па ўсіх накірунках,

калі будзеш проста *заставацца ў гульні*.

Не абавязкова мець хуткі поспех, альбо вынаходзіць нешта незвычайнае.

Больш істотна

дзень ада дня

прыходзіць,

брацца,

і сістэматычна ўкладаць высілкі.

Абставіны замінаюць тваім супернікам гэтак жа моцна, як і табе.

Таму проста будзь у гульні даўжэй за іх.

Проста заставайся ў гульні, ў полі.

Рабі што мусіш, захоўвай спакой, назірай як іншыя прыходзяць і сыходзяць.

Я ведаю як цяжка гэта гучыць для маладых,

бо ў юнацтве мы завязаныя на *адну* спробу.

Думаеш, што навокал “адзіныя шанцы” каторыя марнуюцца назаўсёды.

“Калі не паступлю, не пазнаёмлюся, не паеду, калі ня возьмуць, калі не адкрыюць рахунак, калі не спадабаецца што я зрабіў —

то *ўсё*, *канец!”*

Дык вось — сталеючы, разумееш, што яно менавіта наадварот.

Калі застаешся ў справе — усё навокал працягвае круціцца.

Беручыся за нешта зараз, я дакладна ведаю, што будуць перашкоды.

І я гэтаксама ведаю, што тады ўжо, калі яны з’явяцца — я буду да іх гатовы.

Бо штодзённае пагружэнне ў справу дасць досвед і адказы, пра каторыя я наперад і памысліць не магу.

Амаль усе юнакі спрабуюць мысліць наперад без уліку досведу што атрымаюць у працэсе.

А ён змяняе ўсё.

Заставайся ў гульні.

Што я не сказаў

Светагляд, каторы дапамагае, узмацняе, і праносіць праз цяжкасці — гэта найвялікшая перавага ў сучасным зменлівым і непрадказальным свеце.

Я сабраў асноўнае, што пакуль хацеў сказаць пра рух праз дзівосы жыцця.

Нешта мо прапусціў, нешта адразу няясна, нешта страціць актуальнасць, але гэта *мой* досвед, мае памылкі, мае здабыткі.

Колькі я дапісваў і перапісваў, і ўсё адно пра свет можна пісаць бясконца, і ўсё адно ён будзе большы за любыя кнігі.

Рухайся смела і светла.

Заўсёды памятай што ты не адзін, — з табой Багі, у тваёй крыві сотні тысячаў Продкаў-пераможцаў.

Узвышай усіх навокал сябе і будзь з тымі хто ўзвышае цябе.

Гуляй і перажывай прыгоды.

Узгадвай што мы рабілі разам, куды ездзілі, аб чым жартавалі.

Я заўсёды цябе люблю.

Беларусь - Сакартвэла - Турэччына

2018-2025